Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ЖНІЎНЯ 2012 г. СЕРАДА № 151 (27266) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Надзея АСТАПЧУК:

«ДА АЛІМПІЙСКАГА ЗОЛАТА Я ІШЛА 18 ГАДОЎ»

Лідар сусветнага сезона ў штурханні ядра беларуска Надзея Астапчук з вялікім запасам трываласці стала ўладальніцай залатога медаля на Алімпійскіх гульнях у Лондане. Галоўная спартыўная арэна Гульняў гудзела ад задавальнення ад убачанага. Праўда, за той час, пакуль ураджэнка Брэстчыны аддавала належнае сусветным інфармацыйным агенцтвам і тэлекампаніям, скарыстоўваючы пры гэтымі беларускі сцяг, некаторыя расійскія сайты ўжо паспелі павесіць на стужкі інфармацыю аб сенсацыйнай перамозе беларускай лёгкаатлеткі. Хоць прааналізаваўшы апошнія гады выступленняў Надзі на міжнародных спаборніцтвах — шматлікія перамогі на чэмпіянатах свету і Еўропы, этапах «Брыльянтавай лігі», наўрад ці поспех 32-гадовай спартсменкі быў нечаканым.

Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў спартсменку-інструктара нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы Надзею Астапчук ордэнам Айчыны III ступені. Гэтай узнагароды яна ўдастоена за высокі прафесіяналізм, выдатныя спартыўныя дасягненні і перамогу на XXX летніх Алімпійскіх гульнях.

Ужо ў мікс-зоне, а пазней і на прэс-канферэнцыі выхавальніца трэнера Аляксандра Яфімава «расклала» сваё пераможнае выступленне па частках і з задавальненнем адказала на пытанні.

— Надзея, ці спадзяваліся вы заваяваць залаты алімпійскі медаль так упэўнена? Як ні круці, вам не вельмі шанцавала раней у спартыўным плане. На Алімпійскіх гульнях у Афінах — 4-е месца, у Пекіне вы замкнулі тройку прызёраў. Калі лагічна думаць далей, то і наступным быў бы не чэмпіёнскі п'едэстал.

— У спорце далёка не заўсёды ўсё паддаецца нейкім лагічным разлікам. Бо кожны спартсмен — гэта асоба, са сваімі плюсамі і мінусамі. Што тычыцца мяне, то я адчувала сябе вельмі добра. Летась трэнер мне даў невялікую перадышку, а сёлета мы ўзяліся за справу вельмі сур'ёзна. Скарэкціравалі ўсе моцныя і слабыя бакі і прынялі рашэнне, як будзем рыхтавацца да вырашальных стартаў. Так што золата я чакала, працавала да сёмага поту, вельмі хацела перамагчы. Думаю, што перамога стала заслужаным вынікам.

СТАР. 2

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НЕ ДАЕДУ, ДЫК ДАЛЯЧУ

ПАСКОРЫЦЬ ТЭМПЫ ЎБОРАЧНЫХ РАБОТ І МАКСІМАЛЬНА НАРАСЦІЦЬ ЭКСПАРТ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў паскорыць тэмпы ўборачных работ. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на селектарнай нарадзе па ўборцы ўраджаю, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

На думку Прэзідэнта, кіраўнікі, адказныя за правядзенне ўборачнай кампаніі і іншых спадарожных работ, некалькі самазаспакоіліся.

Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на праблему дысбалансу ў аб'ёмах убранага збожжа па рэгіёнах Беларусі. Асаблівы акцэнт ён зрабіў на Гомельскай вобласці, параўнаўшы яе паказчыкі з больш паўднёвым рэгіёнам — Брэсцкай вобласцю. Так, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, на Брэстчыне, дзе ўбрана 90 працэнтаў плошчы, атрымана больш за 1,3 млн т ураджаю збожжавых. Пры гэтым у Гомельскай вобласці, дзе ўбрана 85 працэнтаў плошчы, атрымана ўсяго толькі 900 тыс т ураджаю. Пры розніцы ў 5 працэнтаў плошчаў — амаль 400 т розніцы ў аб'ёме атрыманага ўраджаю. «Калі б гэта быў першы год, было б не страшна. Але на Гомельшчыне такая тэндэнцыя прадаўжаецца ўжо некалькі гадоў», — сказаў Прэзідэнт, падкрэсліўшы, што такая сітуацыя выклікае насцярожанасць.

Актуальнасць тэмпы арганізацыі ўборачных работ узмацняе і сітуацыя з надвор'ем. Асобныя кіраўнікі думаюць, што такая спякота будзе стаяць і далей. Разам з тым з-за гарачага надвор'я збожжа залішне высушанае. І пры яго ўборцы магчымы вялікія страты. Прэзідэнт папярэдзіў, што з заўтрашняга дня надвор'е рэзка зменіцца, таму неабходна весці ўборку больш хуткімі тэмпамі: «Пры такім парку камбайнаў чаго мы чакаем? Было абяцана да 10 жніўня пры такой сітуацыі скончыць уборку, але ў нас яшчэ трэць ураджаю на палях!»

Кіраўнік дзяржавы на нарадзе таксама закрануў праблему прыпісак з боку сельгасарганізацый і даручыў спецыялістам праверыць, як ідуць справы з дакладнасцю справаздачных даных сельгасарганізацый.

Нараўне з уборкай збожжавых Прэзідэнт паставіў задачу зладжана правесці ўборку лёну, каб забяспечыць збор ільнатрасты высокага класа.

«Але самае галоўнае — пачынаецца сяўба азімых культур, пачалі ўжо сеяць рапс. Мы абавязаны не толькі ўбраць з палёў вырашчанае, але і закласці добрую аснову будучага ўраджаю», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама нагадаў прысутным аб тым, што ў краіне рэалізуецца звышважны праект па рэканструкцыі малочнатаварных ферм, і ўборачная кампанія ні ў якім разе не павінна знізіць тэмпы гэтых работ.

Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным максімальна нарасціць экспарт прадуктаў харчавання.

«Нам трэба не толькі забяспечыць унутраныя патрэбнасці і скараціць імпарт прадуктаў харчавання, але і максімальна нарасціць экспартны патэнцыял, умацаваўшы тым самым эканоміку аграрнай галіны», — сказаў Прэзідэнт.

Інфармацыя паступае аб тым, што значнае зніжэнне збору збожжавых і іншых культур назіраецца ў нашых суседзяў і партнёраў — у Расіі, Украіне, Казахстане і іншых краінах СНД. Істотны недабор ураджаю збожжавых культур прагназуецца ў асноўнай жытніцы свету — ЗША. Не лепшыя разлікі на ўраджай і ў многіх еўрапейскіх краінах», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы перакананы, што ў такой сітуацыі цэны на прадукцыю сельскай гаспадаркі ў свеце будуць расці. «Гэта тэндэнцыя пачынае праглядацца ўжо цяпер. На многія сельскагаспадарчыя культуры цэны значна павышаны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў гэтым годзе ў Беларусі вырашчаны нядрэнны ўраджай. «Я сказаў бы, за апошнія гады нават рэкордны ўраджай збожжа, і не толькі збожжа. Паводле ацэнак спецыялістаў, збожжавая ніва павінна даць больш за 9 млн т. Нядрэнныя разлікі і па іншых культурах. Страціць вырашчанае недапушчальна.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў не дапусціць зніжэння тэмпаў нарыхтоўкі травяных кармоў. Прэзідэнт звярнуў увагу на неабходнасць забяспечыць належныя ўмовы для захавання ўраджаю: «У нас з губернатарамі быў канкрэтны дагавор аб належным захоўванні не толькі збожжа, але і бульбы, пладоў і ягад. Ніякіх буртоў з агародніны ў гэтым годзе быць не павінна».

Акрамя таго, Прэзідэнт звярнуў увагу на своечасовую пастаноўку тэхнікі на захоўванне і даў даручэнне МУС і Мінсельгасхарчу ўзяць гэту работу пад сур'ёзны кантроль. «Мы вельмі шмат і ў вялікіх аб'ёмах аказалі падтрымку вяскоўцам пры закупцы сельгастэхнікі, таму мы маем права праверыць, як яна выкарыстоўваецца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

ПАМЕР СЯРЭДНЯЙ ПРАЦОЎНАЙ ПЕНСІІ ВЫРАС З ПАЧАТКУ ГОДА НА 76,6 ПРАЦЭНТА І ДАСЯГНУЎ BR1676,9 ТЫС.

У Беларусі сярэдняя пенсія ўсіх відаў у жніўні гэтага года складае Br1 млн 657,3 тыс. — на 76,2 працэнта больш, чым у снежні мінулага года. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацабароны.

Памер сярэдняй працоўнай пенсіі ў жніўні гэтага года складае Br1 млн 676,9 тыс., што на 76,6 працэнта перавышае ўзровень снежня мінулага года. Жнівеньская сярэдняя пенсія па ўзросце складае Br1 млн 721,4 тыс., мінімальная па ўзросце (з улікам даплаты да яе) — Br1 млн 210 тыс. Сярэдняя пенсія па інваліднасці складае Br1 млн 516,7 тыс., з прычыны страты карміцеля — Br1 млн 78,3 тыс., за выслугу гадоў — Br2 млн 190,9 тыс., за асаблівыя заслугі перад рэспублікай — Br2 млн 515 тыс.

Сярэдні памер сацыяльнай пенсіі складае ў жніўні гэтага года Br782,4 тыс. — на 47,4 працэнта вышэйшы ў параўнанні са снежнем 2011 года.

Што датычыцца разліковых паказчыкаў, то максімальная пенсія па ўзросце для непрацуючых пенсіянераў (пры стажы 40 гадоў у жанчын і 45 гадоў у мужчын і індывідуальным каэфіцыенце заробку 4,0 і вышэй) складае ў жніўні—кастрычніку гэтага года Br2 млн 600 тыс. 590. Максімальная пенсія па ўзросце для непрацуючых пенсіянераў з ліку былых шахцёраў пры стажы падземнай работы не менш як 10 гадоў у мужчын і 7,5 года ў жанчын — Br3 млн 313 тыс. 440, пры стажы работы на асобных відах падземных і адкрытых горных работ не менш як 25 гадоў у мужчын і 20 гадоў у жанчын — Br4 млн 26 тыс. 290. Максімальная пенсія па ўзросце для працуючых пенсіянераў (пры індывідуальным каэфіцыенце заробку 1,3 і вышэй) — Br1 млн 887 тыс. 740.

Мінімальны памер пенсіі па ўзросце ў жніўні-верасні гэтага года — Br210 тыс. 968 (гэты нарматыў прымяняецца пры вылічэнні сацыяльных пенсій, надбавак і павышэнняў да пенсій, ён складае 25 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва).

Паводле статыстычных даных, у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Беларусі ў чэрвені гэтага года на ўліку знаходзіліся 2 млн 498,1 тыс. пенсіянераў.

Нагадаем, на падставе ўказа ад 16 студзеня 2012 года № 35 «Аб павышэнні пенсій» з 1 жніўня праведзены перараслік працоўных пенсій зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы за другі квартал 2012 года. У выніку працоўныя пенсіі, пры вылічэнні памеру якіх не прымяняецца бюджэт мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (БПМ), са жніўня павялічыліся на 17,1 працэнта. Таксама ў жніўні перараслічаны мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, надбаўкі, павышэнні да пенсій і даплаты асобам старэйшых узростаў у сувязі з ростам БПМ (зацверджаны ўрадам на перыяд з 1 жніўня па 31 кастрычніка ў памеры Br843 тыс. 870, што на 13,6 працэнта вышэй за БПМ, які дзейнічаў з 1 мая па 31 ліпеня гэтага года). Такім чынам, сацыяльныя пенсіі, надбаўкі і павышэнні адпаведна павялічыліся на 13,6 працэнта. З улікам новай велічыні БПМ памеры даплаты да пенсій непрацуючых пенсіянераў са жніўня склалі для людзей, якія дасягнулі ўзросту 75 гадоў, Br158,2 тыс. (75 працэнтаў мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце), якія дасягнулі ўзросту 80 гадоў — Br211 тыс. (100 працэнтаў мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце). У 2012 годзе чакаецца правядзенне перараслiку пенсій яшчэ і з лістапада.

■ Жыллёвае будаўніцтва

ГАДАВЫ ПЛАН — ЗА ТРЫ КВАРТАЛЫ?

Міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль Нічкасаў паведаміў аб станоўчых выніках будаўнічай галіны ў першым паўгоддзі.

Як вядома, перад галіной урадам была пастаўлена задача пабудаваць сёлета жылля ў аб'ёме 4 млн 200 тыс. кв. м, у тым ліку ў першым паўгоддзі — на ўзроўні 2 млн 100 тыс. кв. м. Фактычна за 6 месяцаў года было ўведзена ў эксплуатацыю 2,5 млн жыллёвых «квадратаў», што на 17,6 працэнта больш запланаванага на гэты перыяд, а гадавое заданне на 2012 год ужо выканана на 58,8 працэнта.

Падобная дынаміка дае нагоду спадзявацца, што ў трэцім квартале ў жыллёвым будаўніцтве намеціўся сапраўдны пазітыўны прарыў. Калі прадпрыемствы і трэсты будаўнічага комплексу, а таксама падведамасныя арганізацыі выканкамаў будуць так зладжана працаваць і далей, то гадавое заданне магчыма выканаць ужо нават да пачатку чацвёртага квартала, заявіў Анатоль Нічкасаў.

А ўвогуле, з улікам розных дадатковых крыніц фінансавання і рэгіянальных ініцыятыў, сёлета ёсць магчымасць пабудаваць нават каля 4,5 млн кв. м жылля.

Кіраўнік будаўнічай галіны адзначыў, што, згодна з праектам канцэпцыі дзяржаўнай палітыкі на 2012—2015 гады, у наступным годзе прадугледжана ўвесці жылля ў эксплуатацыю аб'ёмам 6,5 млн кв. м. У 2014 годзе плануецца пабудаваць ужо 8,5 млн кв. м, а ў 2015 годзе неабходна давесці гэты паказчык да 9,5 млн кв. м. Гэтыя планы цалкам рэальныя, бо агульныя магутнасці будаўнічага комплексу краіны дазваляюць будаваць да 10 млн кв. м жылля за год.

Асобна міністр спыніўся на рэалізацыі дзяржаўных інвестыцыйных праграм. Самыя значныя з іх — мадэрнізацыя трох цэментных заводаў Беларусі. Ужо да канца года наша краіна можа завяршыць увод трох новых ліній, пасля чаго агульны аб'ём вытворчасці заводаў складзе каля 10 млн тон цэменту за год. Зараз патрэба будаўнічай галіны Беларусі складае каля 4—5 млн тон цэменту. Таму астатні цэмент магчыма будзе прадаваць за мяжу і атрымліваць неабходную краіне валюту.

Сяргей КУРКАЧ.

ЛІЧБА ДНЯ

71,3%,

або 1731,4 тыс. га, пасяўных плошчаў збожжавых і зернебабовых убрана ў Беларусі.

На 7 жніўня валавы збор збожжа перасягнуў 6,6 млн т. Сельгасарганізацыі Мінскай вобласці намалацілі каля 1,6 млн т, Гродзенскай і Брэсцкай абласцей — 1,287 млн т і 1,265 млн т адпаведна. У Гомельскай вобласці сабрана 900 тыс.т, Магілёўскай — 887 тыс.т, Віцебскай — каля 713 тыс.т. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых культур складае 38,3 ц/га, што на 3,7 ц/га вышэй за мінулагодні паказчык на гэту дату. Найвышэйшую ўраджайнасць маюць сельскагаспадарчыя арганізацыі Гродзенскай вобласці, дзе з аднаго гектара атрымліваюць па 48,8 ц. Ва ўсіх абласцях рэспублікі вядзецца продаж збожжа дзяржаве, яго прададзена ўжо 715,7 тыс.т (60,5 працэнта да плана).

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 21°
Віцебск	+ 23°
Гомель	+ 27°
Гродна	+ 21°
Магілёў	+ 23°
Мінск	+ 22°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.08.2012 г.

Долар ЗША	8350,00	▲
Еўра	10370,00	▲
Рас. руб.	263,50	▲
Укр. грыўня	1030,67	▲

КАРАТКА

Золатавалютныя рэзервы Беларусі ў выключэнні ССРД МВФ скараціліся ў ліпені на $99,3 млн і склалі, паводле папярэдніх звестак на 1 жніўня, $8230,2 млн Як адзначылі ў Нацбанку, на зніжэнне аб'ёму ЗВР аказала ўплыў пагашэнне ўрадам і банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце.

У бюджэт Віцебскай вобласці ад фермерскіх гаспадарак толькі ў першым паўгоддзі паступіла падаткаў на 2,1 млрд рублёў. І, паводле інфармацыі Віцебскай абласной інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, тэмп росту паступленняў у фактычных цэнах склаў 220,5 працэнта, або 1,2 млрд рублёў. Па звестках на пачатак мінулага месяца, на Віцебшчыне дзейнічалі 404 фермерскія гаспадаркі.

Рознічная цана на газ прыродны паліўны кампрыміраваны для запраўкі транспартных сродкаў, які адпускаецца ААТ «Белтрансгаз» спажыўцам Беларусі, будзе павялічана да Br2430 за 1 куб.м.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПОЛЬСКІ ПРЭЗІДЭНТ ВЫРАШЫЎ АБАРАНІЦЬ КРАІНУ ЎЛАСНАЙ ПРА

Прэзідэнт Польшчы Браніслаў Камароўскі выказаў думку, што Варшава павінна стварыць уласную сістэму супрацьпаветранай абароны, якая павінна быць інтэгравана ў натаўскія сістэмы, а ўдзел у амерыканскім праекце назваў памылкай. «У нас павінен быць гэты элемент польскай абароны. Расходаванне велізарных сродкаў на ваенную тэхніку бессэнсоўнае, калі яна не абаронена ад найбольш тыповага і небяспечнага нападу — ракетнага і паветранага. Сёння ў нас састарэлыя сістэмы, якія ўсё менш падыходзяць для абароны краіны», — заявіў Камароўскі. На думку польскага прэзідэнта, гэтая сістэма павінна быць часткай агульнай сістэмы супрацьпаветранай сістэмы НАТА. Удзел у планах стварэння амерыканскай ПРА, якія з прыходам у Белы дом Барака Абамы былі перагледжаны, Камароўскі лічыць палітычнай памылкай. Камароўскі адзначыў, што польскія ўлады пралічыліся, калі пагадзіліся на прапанову ЗША па размяшчэнні сістэм амерыканскай ПРА без уліку рызыкі, звязанай са зменай прэзідэнта.

ЗАПУСК РАКЕТЫ-НОСЬБІТА «ПРАТОН-М» З ДВУМА СПАДАРОЖНІКАМІ СУВЯЗІ СКОНЧЫЎСЯ НЯЎДАЧАЙ

Запуск з Байканура ракеты-носьбіта «Пратон-М» з двума спадарожнікамі сувязі «скончыўся няштатна», паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на Раскосмас. Прычынай няўдачы, па папярэдніх звестках, стаў збой у працы разгоннага блока «Брыз-М» — два ўключэнні разгонніка прайшлі штатна, а трэцяе не адбылося. Ракета-носьбіт «Пратон-М» з расійскім і інданезійскім тэлекамунікацыйнымі касмічнымі апаратамі «Экспрэс -МД-2» і «Тэлкам-3» стартавала з Байканура 6 жніўня ў 23.31 па маскоўскім часе. Паводле ацэнкі экспертаў, агульны ўрон ад страты двух апаратаў можа скласці ад 6 да 8,5 мільярда расійскіх рублёў.

МЁД ПРАЦУЕ ЛЕПШ СРОДКАЎ АД КАШЛЮ

Калі даць дзіцяці, якое пакутуе ад кашлю, чайную лыжку мёду да таго, як яно пойдзе спаць, то ноччу яго не будуць мучыць прыступы кашлю, паказала даследаванне, вынікі якога надрукаваны ў часопісе Pediatrics. Так, дзеці 1-5 гадоў, якія мелі інфекцыі горла, менш кашлялі і лепш спалі пасля таго, як ім далі 10 грамаў мёду перад сном, распавядае The Telegraph. У мёдзе змяшчаюцца ў вялікай канцэнтрацыі антыаксіданты, і, на думку навукоўцаў, ён можа цалкам замяніць сіропы ад кашлю. Дарэчы, многія сіропы, як было даказана, не працуюць ці ўвогуле ўяўляюць небяспеку пры перадазаванні.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЭКС-СТАРШЫНЯ ЕЦБ: ПРАБЛЕМА ЕЎРОПЫ — НЕДАХОПЫ Ў КІРАЎНІЦТВЕ

Былы старшыня Еўрапейскага цэнтрабанка (ЕЦБ) Жан-Клод Трышэ па-ранейшаму верыць у паспяховую будучыню адзінай еўрапейскай валюты. Ён з'яўляецца прыхільнікам стварэння банкаўскага і бюджэтнага саюзаў. Акрамя таго, спадар Трышэ лічыць, што тыя дзяржавы, якія не выконваюць заключаных дамоўленасцяў, павінны быць пастаўлены пад цэнтралізаваны нагляд.

Многія людзі баяцца, што вынікам бясконцых акцый па выратаванні праблемных краін можа стаць рост інфляцыі. Жан-Клод Трышэ адзначыў, што прагнозы рынкаў на бліжэйшыя 10 гадоў цалкам супадаюць з уяўленнямі аб цэнавай стабільнасці, а менавіта з узроўнем інфляцыі, блізкім да 2%, але ўсё-такі ніжэйшым за гэтую велічыню. На яго думку, праз 10 гадоў будуць не толькі стабільныя цэны, алё і еўра. «У зоне еўра мы маем зараз крызіс банкаў і некаторых дзяржаў, але сама валюта вельмі моцная», — падкрэсліў Трышэ.

На думку эксперта, трэба павялічыць устойлівасць фінансавай сістэмы. Шмат што ўжо зроблена, напрыклад, павялічаны патрабаванні да долі ўласнага капіталу банкаў. Многае яшчэ трэба зрабіць, напрыклад, што тычыцца ценявых банкаў. Аднак нашмат важней, што мы да гэтага часу ў дастатковай меры не зразумелі, чаму крызіс 2008-2009 гадоў мог развівацца так хутка і драматычна.

Трышэ лічыць, што зараз мы знаходзімся на трэцім этапе крызісу — гэта крызіс дзяржаўгоў. Ён пачаўся ў канцы 2009 года і часткова стаў вынікам спробы пазбегнуць крызісу ў рэальнай эканоміцы, які аказаўся б горшым, чым Вялікая дэпрэсія 1929 года. І на сваім трэцім этапе крызіс застаецца глабальным. Пад пагрозай знаходзіцца плацежаздольнасць усіх буйных прамыслова развітых дзяржаў. Але Еўропа — эпіцэнтр гэтага крызісу.

Жан-Клод Трышэ ахарактарызаваў сённяшнюю сітуацыю ў зоне еўра як парадаксальную. Калі браць зону еўра як цэлае, то дэфіцыт яе бюджэту складае толькі палову ад паказчыкаў Японіі, ЗША ці Вялікабрытаніі. Агульны баланс зоны еўра збалансаваны, у той час як у ЗША існуе яго дысбаланс. Такім чынам, зона еўра як цэлае знаходзіцца ў выдатнай форме буйной індустрыяльна развітай краіны. «Наша праблема — недахопы ў кіраўніцтве», — заявіў Трышэ.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ВЕЦЕР ПАКІНУЎ БЕЗ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ

Мінулай ноччу з-за моцнага ветру на тэрыторыі Мінскай вобласці без электразабеспячэння застаўся шэраг прыватных жылых дамоў у Мядзельскім і Вілейскім раёнах. Як паведамілі ў цэнтры прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС, без электрычнасці на Мядзельшчыне з паловы першай гадзіны ночы застаўся агулам 861 прыватны жылы дом (1775 чалавек), на Вілейшчыне з трох гадзін ночы — 1 409 прыватных жылых дамоў (2443 чалавекі). Аб'екты жыццязабеспячэння пад адключэнне электраэнергіі не патрапілі. Да ранку электразабеспячэнне было адноўлена.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота Петра ФАМІНА.

Мінск. Вецер ламаў дрэвы.

ЗАТ «ГК БАНК» ЗАСТАЎСЯ НА 1 ГОД БЕЗ ЛІЦЭНЗІІ

Нацбанк прыняў рашэнне аб прыпыненні на 1 год дзеяння ліцэнзіі ЗАТ «ГК Банк» на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці датычна некаторых банкаўскіх аперацый. Вось іх пералік: прыцягненне грашовых сродкаў фізічных і юрыдычных асоб ва ўклады (дэпазіты); выдача банкаўскіх гарантый; давернае ўпраўленне грашовымі сродкамі па дамове давернага ўпраўлення грашовымі сродкамі; выпуск у абарачэнне банкаўскіх пластыкавых картак; выдача каштоўных папер, якія пацвярджаюць прыцягненне грашовых сродкаў ва ўклады (дэпазіты) і размяшчэнне іх на рахунку; фінансаванне пад уступку грашовага патрабавання (факторынг). Такое рашэнне, па звестках упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка, выклікана невыкананнем ЗАТ «ГК Банк» прадпісання аб ліквідацыі парушэнняў заканадаўства Беларусі і накіравана на абарону інтарэсаў крэдытораў банка. Дарэчы, гэта ўсё не прывядзе да ўзнікнення ў ЗАТ «ГК Банка» абавязацельстваў па датэрміновым выкананні дамоў з укладчыкамі і іншымі крэдыторамі. Усе абавязацельствы будуць выконвацца ў адпаведнасці з раней заключанымі дамовамі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ПАЖАР НА ФАНЕРНА-ЗАПАЛКАВЫМ КАМБІНАЦЕ

Выратавальнікі ліквідавалі ўчора пажар на Гомельскім фанерна-запалкавым камбінаце. Паведамленне аб узгаранні паступіла ў абедзенны час, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС. На месца выкліку былі накіраваны пажарныя разлікі і спецыялізаваная тэхніка. Паводле папярэдняй інфармацыі, загарэліся шчэпкі, якія складзіраваліся на тэрыторыі прадпрыемства. Плошча пашкоджання агнём дасягнула 200 кв.м. Пацярпелых няма. Пажар быў лакалізаваны. Пагрозы ўзгарання вытворчых будынкаў і збудаванняў няма.

«ДА АЛІМПІЙСКАГА ЗОЛАТА Я ІШЛА 18 ГАДОЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— З пазіцыі бальшчыка было відаць, што фінал атрымаўся далёка не самы інтрыгуючы. Сваё чэмпіёнства вы аформілі ўжо ў другой спробе, а ў трэцяй, лічы, паставілі тлустую кропку — 21.36 м. Далей прыйшлося сумаваць.

— Так атрымалася, што фінал не паспеў нікому паказытаць нервы. А вось тое, што было да яго — пужала. Нас вывелі на старт яшчэ за паўтары гадзіны да гадзіны «ікс». Доўгі час марнавалі ў кол-румах — такіх спецыяльных памяшканнях. А там духата плюс скразнякі. Непакоілася, каб раптам не прыхапіла прастуда, таму ўзяла з сабой цёплы ручнік. Але ж гэта, можна сказаць, першая частка залатога старту. У фінал трапілі 8 лепшых, хоць напачатку ў пратаколе значылася больш за 30 спартсменак. Зразумела, што ў спісе прэтэндэнтаў на медалі значыліся самыя лепшыя. Сярод іх — мая пастаянная саперніца новазеландка Валеры Адамс, кітаянка Лі Лінг і шэраг іншых кандыдатаў, гатовых паднесці ў любы момант сюрпрыз. У нас гэта часта здараецца, калі ў шостай спробе табе хто-небудзь гатовы насаліць. Таму расслабіцца не давялося ні на секунду. Палёгка на душы наступіла пасля таго, як мае асноўныя саперніцы, у тым ліку і расіянка Яўгенія Калодка, штурхнулі ядро далёка да майго выніку. Тады я зразумела: я — алімпійская чэмпіёнка. У гэта цяжка было паверыць. Бо да залатога алімпійскага медаля я ішла з самага пачатку сваёй біяграфіі — цэлых 18 гадоў.

— Надвор'е магло ўнесці свае карэктывы ў заваяванне і размеркаванне месцаў на п'едэстале?

— Калі ты выступаеш пад адкрытым небам, то можна чакаць любых непрыемнасцяў: моцнага ветру, дажджу... Гэтага вельмі баялася. Справа ў тым, што ў мяне траўмавана левае калена. А калі сектар для штурхання мокры, то я не магу належным чынам кінуць снарад, бо нага пачынае падціскацца і няма штуршка. Дзякуй Богу, усё абышлося.

— Ваша асноўная саперніца з Новай Зеландыі Валеры Адамс, з якой вы перыядычна мяняецеся прызавымі месцамі на топ-турнірах, павіншавала з залатым медалём?

— Так, але з невялікай ахвотай. А мне што, я ж ні ў кога нічога не ўкрала, зарабіла залаты медаль у сумленнай барацьбе.

— Брытанская публіка была шакіравана вашым выступленнем на алімпійскім стадыёне, адарыла чэмпіёнку бурнымі авацыямі. Наколькі вядома, вам ужо даводзілася выступаць на арэнах туманнага Альбіёна...

— Я люблю спаборнічаць у Вялікабрытаніі. Тут своеасаблівая атмасфера, адмысловыя заўзятары, якія любяць цябе і падтрымліваюць.

— Вы таксама зараз можаце аказаць падтрымку, калі адкажаце, што мяркуеце зрабіць з прэміяй ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба ў 100 мільёнаў рублёў, якая будзе выдзелена ў рамках акцыі «Выбар года»?

— Думаю, будзе добра, калі гэтая сума адправіцца на адрас Столінскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы. Гэта будзе мой своеасаблівы ўклад у развіццё спорту на маёй радзіме.

— Вы амаль два дзясяткі гадоў ішлі да запаветнай мэты. Як збіраецеся адзначаць феерычны поспех на лонданскай Алімпіядзе?

— Мяркую, што з пераможнымі алімпійскімі фанфарамі давядзецца пачакаць. У маіх бліжэйшых планах выступленні на чатырох этапах «Брыльянтавай лігі», якія павінны прайсці ў Еўропе на працягу жніўня. Таму праз некалькі дзён пасля заканчэння Гульняў я зноў буду ў дарозе. І зноў буду хвалявацца, думаць пра тое, як не спасаваць на старце і дабіцца самага высокага выніку. Ну а потым можна будзе падумаць і пра тое, як адзначыць перамогу. Галоўнае, што яна ёсць. Усё астатняе — гэта дэталі.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Медальнаму працягу — быць!

Учора беларуская каманда жыла феерычнай перамогай Надзеі Астапчук у штурханні ядра. Пытанні ўзнікалі толькі наконт выступлення мінчанкі Наталлі Міхневіч, якая не змагла прабіцца ў васьмёрку мацнейшых, каб паўдзельнічаць у размеркаванні алімпійскіх медалёў. Пытанне — чаму так слаба выступіла неаднаразовая прызёрка чэмпіянатаў свету, уладальніца сярэбранай узнагароды ў Пекіне — застаецца пакуль адкрытым. У мікс-зоне для размоў з журналістамі спартсменка пасля заканчэння вячэрняй праграмы не спынілася. Магчыма, уся справа ў тым, што Наталля разнервавалася пасля няўпэўненага выхаду ў сектар для штурхання ядра свайго мужа Андрэя. Як вядома, ён не змог нават адолець кваліфікацыйны адбор. Для чэмпіёна свету і прызёра Алімпійскіх гульняў гэта, відавочна, было непрыемным сюрпрызам. Праўда, пасля таго, як Аліна Талай выйшла ў паўфінальны забег на 100 м з перашкодамі, акцэнты канчаткова змясціліся ў бок алімпійскага стадыёна. Фінал у гэтай дысцыпліне адбыўся познім вечарам па мясцовым часе. У астатніх лёгкаатлетычных дысцыплінах, дзе прадстаўлены беларусы, прайшлі кваліфікацыйныя спаборніцтвы.

Днём увагу многіх беларускіх журналістаў прыцягнуў спартыўны комплекс ExEl, дзе сваю алімпійскую праграму завяршалі барцы грэка-рымскага стылю. Адзіным нашым прадстаўніком у гэтай дысцыпліне стаў гамяльчанін Цімафей Дзейнічэнка (да 96 кг). Ён паспяхова прайшоў кваліфікацыйны паядынак, перамог у 1/8 фіналу і 1/4, трапіўшы ў паўфінал, але там саступіў. Днём раней не змаглі прабіцца скрозь сіта адбору яго калегі Алім Селімаў (84 кг) і Іосіф Чугашвілі (120 кг). Свае паядынкі яны прайгралі яшчэ на стадыі 1/8 фіналу, хоць лёс падарыў ім магчымасць трапіць у паўфінал праз суцяшальныя паядынкі і пазмагацца за бронзу. На жаль, не атрымалася. І гэта з улікам таго, што старшыня Беларускай федэрацыі барацьбы і генеральны дырэктар кампаніі «Трайпл» Юрый Чыж паабяцаў тым атлетам, якія пакажуць добры вынік, аддзячыць.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

НЕАФІЦЫЙНЫ МЕДАЛЬНЫ ЗАЛІК				
Краіна	Золата	Серабро	Бронза	Усяго
Кітай	33	20	16	69
ЗША	29	15	20	64
Вялікабрытанія	20	12	12	44
Паўднёвая Карэя	11	5	6	22
Расія	8	17	18	43
Францыя	8	9	10	27
Італія	7	6	4	17
Казахстан	6	0	1	7
Германія	5	13	7	25
Нідэрланды	5	2	6	13
Венгрыя	4	1	3	8
КНДР	4	0	1	5
Куба	3	3	1	7
БЕЛАРУСЬ	3	2	3	8
Новая Зеландыя	3	1	4	8
ПАР	3	1	0	4
Украіна	3	0	6	9
Японія	2	12	14	28
Аўстралія	2	12	8	22
Данія	2	4	2	8
Румынія	2	4	2	8
Бразілія	2	1	5	8
Польшча	2	1	5	8
Іран	2	1	1	4
Ямайка	2	1	1	4
Харватыя	2	1	0	3
Эфіопія	2	0	2	4
Іспанія	1	4	1	6
Канада	1	3	6	10
Швецыя	1	3	2	6
Чэхія	1	3	1	5
Кенія	1	2	2	5
Славенія	1	1	2	4
Грузія	1	1	0	2
Дамініканская рэспубліка	1	1	0	2
Швейцарыя	1	1	0	2
Літва	1	0	1	2
Грэнада	1	0	0	1
Венесуэла	1	0	0	1
Мексіка	0	3	2	5
Калумбія	0	3	1	4
Егіпет	0	2	0	2
Славакія	0	1	3	4
Азербайджан	0	1	2	3
Бельгія	0	1	2	3
Індыя	0	1	2	3
Арменія	0	1	1	2
Інданезія	0	1	1	2
Манголія	0	1	1	2
Нарвегія	0	1	1	2
Сербія	0	1	1	2
Туніс	0	1	1	2
Гватэмала	0	1	0	1
Кіпр	0	1	0	1
Малайзія	0	1	0	1
Тайланд	0	1	0	1
Тайвань	0	1	0	1
Фінляндыя	0	1	0	1
Эстонія	0	1	0	1
Грэцыя	0	0	2	2
Малдова	0	0	2	2
Сінгапур	0	0	2	2
Аргентына	0	0	1	1
Ганконг	0	0	1	1
Кувейт	0	0	1	1
Саудаўская Аравія	0	0	1	1
Турцыя	0	0	1	1
Узбекістан	0	0	1	1
Пуэрта-Рыка	0	0	1	1
Катар	0	0	1	1
Трынідыад і Табага	0	0	1	1

КОШТ ЖЭТОНА Ў МЕТРО ПАКУЛЬ РАНЕЙШЫ

732 тысячы чалавек за дзень — такі сярэдні пасажырапаток у сталічнай падземцы сёння. Нягледзячы на гэта, акупляецца яна толькі на 55 працэнтаў. Як расказаў начальнік Мінскага метрапалітэна Расціслаў ЮРЭНЯ падчас сустрэчы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры, сабекошт адной паездкі ў метро складае 3-4 тысячы рублёў. Розніца з цаной жэтона кампенсуецца метрапалітэну з гарадскога бюджэту. Пры гэтым, па словах спадара Юрэні, жэтон пакуль будзе каштаваць, як і зараз — 1,5 тысячы рублёў.

Адным з пытанняў, якое закранулі журналісты, была бяспека ў метро. Зусім нядаўна ў падземцы была створана служба аховы. Складаецца яна са 166 чалавек, якія займаюцца патруляваннем станцый. Пры гэтым супрацоўнікі МУС сваю працу ў метрапалітэне не страцяць. Ужо зараз у метро ўсталёўваецца новая тэхніка, якая дапаможа хутка і якасна праверыць занадта вялікі багаж падазронага пасажыра, не адкрываючы яго.

Сёлета на станцыях з'явіліся лакалізатары выбуху. Любы аб'ект, які выкліча занепакоенасць у супрацоўнікаў аховы, будзе вельмі хутка перамешчаны ў лакалізатар і даследаваны. За гэты год на станцыях з'явілася яшчэ 300 новых відэакамер. Зараз іх агульная колькасць перавышае 900. Камеры ў вагонах — таксама справа недалёкай будучыні. Усе гэтыя захады зробяць знаходжанне пасажыраў у метро значна больш спакойным, спадзяецца Расціслаў Юрэня.

Усталяванне шутц-ліній жоўтага колеру, якія павінны і зрокава, і тактыльна папярэджваць пасажыраў аб краі платформы, скончыцца сёлета. Паставіць на станцыях загароды з дзвярыма, якія адчыняюцца, толькі калі цягнік знаходзіцца на прыпынку, — гэтая прапанова даўно гучала з вуснаў прыхільнікаў бяспечнай падземкі. Ідэя, па словах Расціслава Юрэні, вельмі складаная ў рэалізацыі. Спыніць цягнік у дыяпазоне 15 сантыметраў чалавек не зможа. Праблема вырашальная: цягнікі з аўтакіраваннем спраўляюцца з такой задачай на «ўра». Начальнік метрапалітэна паведаміў, што прадпрыемства ўжо выказала свае пажаданні па будаўніцтве трэцяй лініі метро. Сярод гэтых пажаданняў ёсць і загароды з дзвярыма.

Будучыня метро не толькі ў бяспецы, але і ў камфартабельнасці. Для новых станцый, якія пачнуць працаваць ужо праз месяц, было набыта 7 саставаў. Гэта было зроблена, каб захаваць ужо існуючы інтэрвал паміж цягнікамі ў час пік (з 7 да 9 гадзін раніцы) — 2 хвіліны.

Расціслаў Юрэня паабяцаў, што хутка мінчане ўбачаць і іншыя вагоны, 760-й серыі. Галоўнае і самае важнае іх адрозненне ад тых, што эксплуатуюцца зараз, — адсутнасць паветразаборнікаў і фортак. Яны заменены кандыцыянерамі. У вокнах стаяць шклопакеты, таму гук цягніка для пасажыраў будзе амаль не чутны.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

У МІНСКУ ЗАСТРЭЛІЛІ РАСІЯНІНА

Мінулай ноччу ў Мінску каля 1.10 у дварах жылога дома па вуліцы К. Чорнага быў забіты грамадзянін Расіі 1967 года нараджэння, паведамілі БЕЛТА ў Следчым камітэце Беларусі. У СК лічаць, што забойцаў было некалькі. «Адпрацоўваюцца ўсе магчымыя версіі гэтага злачынства. Адна з асноўных — заказное забойства, звязанае з крымінальнымі разборкамі», — сказалі ў СК.

Следчым камітэтам Беларусі заведзена крымінальная справа па ч.1 арт.139 КК Беларусі (забойства). Праводзяцца неадкладныя следчыя дзеянні. У СК паведамілі, што для расследавання абставін злачынства і ўстанаўлення вінаватых асоб створана следчая група з ліку найбольш вопытных следчых і крыміналістаў, якія спецыялізуюцца ў расследаванні такой катэгорыі крымінальных спраў. Следства працуе ў цесным узаемадзеянні з аператыўнымі падраздзяленнямі органаў унутраных спраў.

■ У свеце

ЗША ЖАДАЮЦЬ НОВАЙ ХАЛОДНАЙ ВАЙНЫ?

У студзені 2012 года Барак Абама прадставіў у Пентагоне грамадскасці новую ваенную стратэгію, якой запланавана перамяшчэнне ўвагі з рэгіёна Атлантыкі на рэгіён Азіяцка-Ціхаакіянскі. Праз некалькі дзён у кітайскай газеце China daily быў апублікаваны артыкул пад назвай «Спроба захаваць дамінаванне», у якім аўтар, супрацоўнік Інстытута амерыканскіх даследаванняў Кітайскай акадэміі сацыяльных навук ахарактарызаваў гэтую стратэгію як «непрыкрыты намер стрымлівання і супрацьстаяння ўплыву Кітая, які расце ў рэгіёне».

У лютым таго ж года на Гуаме былі праведзены сумесныя ваенныя вучэнні ЗША, Японіі і Аўстраліі, якія японскае агенцтва Kyodo News расцаніла як захад па стрымліванні росту ваеннай прысутнасці Кітая ў Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне. А ўлічваючы, што яшчэ да гэтага ЗША і Аўстралія дамовіліся ў будучыні дадаткова размясціць у Аўстраліі 2500 амерыканскіх марскіх пехацінцаў, у наяўнасці нарошчванне ваеннай прысутнасці ў рэгіёне, якое можа мець на сваёй мэце толькі Кітай.

У сакавіку 2012 года высокапастаўлены амерыканскі чыноўнік з Міністэрства абароны заявіў, што Індыя — адзіная краіна, вылучаная ў новай стратэгіі для ўмацавання ўзаемадзеяння. Улічваючы, што Індыя з'яўляецца суседам Кітая і мае з ім сур'ёзныя супярэчнасці, мэта Вашынгтона і ў гэтым выпадку зразумелая.

У артыкуле, апублікаваным 31 ліпеня 2012 года ў New York Times, абмяркоўваецца 110-старонкавы даклад, падрыхтаваны Цэнтрам стратэгічных і міжнародных даследаванняў, у якім новая ваенная стратэгія крытыкуецца за недахоп фінансавання. У гэтым дакладзе прама сцвярджаецца, што для ЗША стаўкі ўзрастаюць у Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі, якія пацвярджаюцца патэнцыйна дэстабілізуючымі дзеяннямі Кітая. Апошні, з пункту гледжання аўтараў даклада, імкнецца пашырыць свой суверэнітэт у Паўднёва-Кітайскім моры і над астравамі ў рэгіёне. Аўтары даклада заклікаюць выдзеліць фінансаванне для дадатковай падводнай атакуючай лодкі для базавання на Гуаме, размясціць яшчэ адну дэсантную групу марскіх пехацінцаў (звычайная колькасць такой групы — 5000 салдат, аснашчаных ваеннымі караблямі, самалётамі і ўдарнымі верталётамі), гатовых да хуткага рэагавання ў рэгіёне, перавёўшы іх з Атлантыкі, і развіваць сістэму ПРА.

Асноўнае пытанне да стваральнікаў як новай амерыканскай ваеннай стратэгіі, так і да аўтараў даклада ўзнікае неадкладна: а што ЗША забылі ля берагоў Кітая ў моры, якое нават у сваёй назве намякае на прыналежнасць да ўзбярэжжа Кітая, будучы краінай, размешчанай на іншым беразе Ціхага акіяна? Чаму амерыканскія стратэгі лічаць, што маюць права нарошчваць ваенную прысутнасць ля берагоў азіяцкай дзяржавы, якая імкліва расце і якая, зразумела, не можа разглядаць гэта як міралюбівы жэст у свой бок? І адказ натуральны — Вашынгтон асцерагаецца, што рост Кітая адцясніць ЗША з прысвоенай імі пазіцыі адзінай звышдзяржавы, і паспрабуе на раннім старце так аблытаць Кітай ваеннымі базамі, падводнымі лодкамі, ракетамі і ваеннымі групоўкамі, каб быць гатовым да ваеннага вырашэння пытання з канкурэнтам, калі гэта спатрэбіцца.

Пры гэтым Кітай у дадзены момант не робіць нічога такога, што магло б быць расцэнена кіраўніцтвам ЗША як праяўленне варожых намераў да Вашынгтона. Кітай не збірае антыамерыканскія ваенныя групоўкі ля берагоў ЗША, не плануе перакідванне туды вялікіх груп салдат або атакуючых падводных лодак, не ўсталёўвае на Кубе або ў Венесуэле свае ракеты, як гэта робяць ЗША ў бліжэйшых да Кітая дзяржавах.

Кітайскае кіраўніцтва не можа нарадавацца на тое, як яму ўдаецца мірна, у рамках сумленнай эканамічнай канкурэнцыі імкліва нарошчваць патэнцыял сваёй эканомікі і планамерна павышаць узровень жыцця грамадзян. Кітайскім кіраўнікам зразумела, што мілітарызацыя эканомікі па амерыканскім або савецкім узорах, як і пераход да сур'ёзнай геапалітычнай канфрантацыі, знізяць эканамічныя магчымасці, якія маюцца, і не прынясуць бачных пераваг.

Але, улічваючы яўна варожы характар дзейнняў амерыканскай адміністрацыі, Кітаю, відаць, давядзецца ў будучыні ісці на такія крокі. Хутчэй за ўсё, падобнае можна чакаць праз 10—15 гадоў, калі эканоміка Кітая стане больш за эканоміку ЗША і новую магутную звышдзяржаву пачне раздражняць надакучлівая ваенная прысутнасць амерыканскіх войскаў ля сваіх межаў. Але ўсё ж — без правакацыйных дзейнняў, што ўчыняе амерыканскі ўрад, цалкам магчыма, удалося б пазбегнуць у адказ падобнага сцэнарыю падзей.

Па сутнасці, ЗША сваёй тактыкай прымушаюць Кітай з максімальна мірнай звышдзяржавы, якая адкрыта расце, стаць падобным да сябе. Вашынгтон можа ў выніку наклікаць новую халодную вайну, але разваляцца ў выніку яе не праціўнік ЗША Кітай, як гэта было з СССР — а самі ЗША, у якіх унутраныя супярэчнасці імкліва ўзрастаюць на фоне паступальнага вырашэння ў Кітаі існуючых праблем.

Сяргей КІЗІМА,
загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.
Блог аўтара: serkiz@livejournal.com

■

ОАО «МЕХКОЛОННА № 93»

ПРОВОДИТ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ,

которое состоится **10 сентября 2012 года** в актовом зале ОАО «Мехколонна № 93» в 10.30.

Повестка дня

1. Изменение Уставного фонда.

УНП 100003019

Извещение о проведении 11 сентября 2012 года торгов по продаже имущества ОАО «Белпромтара»

Наименование и характеристики продаваемого имущества	- здание производственное общей площадью 104,3 кв. м (здание специализированное иного назначения, инв. номер 110/С-91789); - буфет общей площадью 157,2 кв. м (здание специализированное розничной торговли, инв. номер 110/С-87252); - гараж общей площадью 22,3 кв. м (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)), инв. номер 110/С-94176); - котельная общей площадью 263,3 кв. м (здание специализированное иного назначения, инв. номер 110/С-87257); - биллиардная общей площадью 57,7 кв. м (здание специализированное иного назначения, инв. номер 110/С-87265); - административно-бытовое здание общей площадью 119 кв. м (здание административно-хозяйственное, инв. номер 110/С-87279); - красный уголок общей площадью 136,5 кв. м (здание специализированное иного назначения, инв. номер 110/С-87291); - склад топлива общей площадью 288,1 кв. м (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. номер 110/С-87273); - туалет (площадь застройки 4,55 кв. м, инв. номер бухг. 710); - забор железобетонный общей площадью ограждения 152,75 кв. м (инв. номер бухг. 70); - пожарный водоем емкостью 60 куб. м (инв. номер бухг. 71); - теплотрасса (длина сети 65 м, инв. номер бухг. 57); - водопроводная сеть (длина сети 112,5 м, инв. номер бухг. 549); - зеленые насаждения (деревья), 12 шт.; - зеленые насаждения (газоны), общая площадь 1575 кв. м; - зеленые насаждения (цветник), общая площадь 11 кв. м; - камера сушильная КС-60-РЭ (инв. номер бухг. 556); - котел паровой Е-1/9-1 (инв. номер бухг. 8).
Сведения о земельном участке	площадь – 0,5212 га, кадастровый номер 141000000007003251, назначение – земельный участок для обслуживания производственной базы
Местонахождение продаваемого имущества	Брестская область, г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, д. 25
Сведения о продавце	ОАО «Белпромтара», 1-ый Твердый пер., 7, 220037, г. Минск
Сведения об организаторе аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск
Начальная цена предмета торгов	2 039 085 000 белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	200 000 000 белорусских рублей

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Белпромтара», утвержденным организатором торгов.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019, в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 20 календарных дней со дня проведения аукциона.

Оплата вознаграждения за организацию и проведение торгов осуществляется победителем торгов (покупателем).

Аукцион состоится 11 сентября 2012 года в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 10.08.2012 по 07.09.2012 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017)327 48-36, (017)291 83 10, (029)636 15 22.

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 17 августа 2012 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Инженерная инфраструктура *	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	г. Заславль, ул. Загородная, 26	623650100001004277	0,0933 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	84 000	160 000 000	32 000 000
2	г. Заславль, ул. Комсомольская	623650100001004601	0,1490 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, водопровод	3 102 410	132 000 000	26 400 000
3	г. Заславль, ул. Молодежная	623650100001004600	0,1014 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ	3 102 410	174 000 000	34 800 000
4	Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи, массив № 3, участок № 1	623655500001000419	0,2304 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	84 000	83 000 000	16 600 000
5	Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи, массив № 3, участок № 2	623655500001000441	0,1925 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	84 000	69 000 000	13 800 000
6	Мачулищанский п/с, д. Мачулищи, массив № 3, участок № 9	623655500001000545	0,1575 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	84 000	57 000 000	11 400 000
7	Мачулищанский п/с, д. Мачулищи, массив № 3, участок № 17	623655500001000526	0,1575 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	84 000	57 000 000	11 400 000
8	Мачулищанский п/с, д. Мачулищи, массив № 3, участок № 19	623655500001000440	0,1575 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	84 000	57 000 000	11 400 000
9	Михановичский с/с, д. Березина, участок № 4	623684200601000033	0,1445 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	84 000	56 000 000	11 200 000
10	Михановичский с/с, д. Березина, участок № 13	623684200601000038	0,1536 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	84 000	59 000 000	11 800 000
Сотні людзей штодзень праязджаюць па дарозе Мінск — Гродна. І днём, і ноччу праз чыгуначную станцыю Скрыбаўцы ідуць цягнікі. Нямногія заўважаць на аўтастрадзе паказальнік з надпісам на карычневым фоне: «Храм-крэпасць XVI стагоддзя». Не кожны дагадаецца паглядзець у акно цягніка, праязджаючы гэты населены пункт. Нехта ідзе сваёй дарогай, нават не азірнецца. А хтосьці пераадольвае вялікі шлях, нават дзяржаўную мяжу, каб палюбавацца ўнікальным помнікам архітэктуры, гісторыка-культурнай каштоўнасцю Беларусі — Царквой у гонар нараджэння Прасвятой Багародзіцы.

Знаходзіцца храм-крэпасць у вёсцы Мураванка, што ў Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці. У народзе яго так і называюць — «Мураванка». Ёсць у царквы яшчэ адно найменне — «Маламажэйкаўская». А ўсё таму, што раней храм адносіўся да вёскі Малое Мажэйкава Лідскага раёна, што за 3 кіламетры адсюль.

Маламажэйкаўская царква — помнік абарончага дойлідства гатычна-рэнесанснага стылю. У краіне ёсць яшчэ адзін падобны храм — у Сынкавічах, таксама на Гродзеншчыне. Аналагаў ім у Беларусі больш няма. Няшмат іх і ў свеце. Таму турысты з Расіі, Польшчы, Украіны, Літвы і нават Чэхіі тут частыя госці.

Апошнім часам стала сюды наведвацца і больш беларусаў. На гэты выпадак на ўваходзе ў храм — інфармацыя з нумарам тэлефона прыхаджанкі царквы, якая сустракае гасцей і праводзіць экскурсіі. Калі мы патэлефанавалі, Алена Рудзінская пакінула ўсе свае справы і хутка прыйшла ў царкву. Не адмовіла б жанчына ў правядзенні экскурсіі нават аднаму цікаўнаму. І ўсё абсалютна бясплатна! Аддзякаваць можна па-іншаму: ці свечку купіць, ці буклет на памяць, ці проста ахвяраваць на царкву.

Дакладная дата ўзвядзення храма-крэпасці невядомая і сёння. Яшчэ нядаўна лічылася, што Царква ў гонар нараджэння Прасвятой Багародзіцы была пабудавана паміж 1516—1542 гадамі. Праўда, не захавалася ні аднаго дакумента, які б гэта пацвярджаў. А ўсё таму, што тры стагоддзі храм існаваў як праваслаўны, два стагоддзі ён быў уніяцкім. Калі царква пераходзіла ў рукі ўніятаў, то праваслаўныя святары былі адпраўлены ў выгнанне. І ўсе, нават самыя старажытныя дакументы, яны забралі з сабой. Аднак аб гэтым часавым дыяпазоне сведчыць архітэктура храма, якая была характэрна для першай паловы XVI стагоддзя.

Некаторыя даследчыкі даўніны, археолагі, аглядзеўшы мур цэглы і асаблівасці збудавання, выказалі меркаванне, што Маламажэйкаўская царква пабудавана амаль на 100 гадоў раней, у адзін час з падобнай ёй царквой у Сынкавічах, у XV стагоддзі. Названы нават канкрэтны год — 1407. Пра гэта сведчыць і буклет, які быў выдадзены ў 1907 годзе да 500-годдзя ўзвядзення храма. Праўда, ёсць і яшчэ адна версія.

— Падчас рэканструкцый царквы ў 1817 і 1871 — 1872 гадах пры расчысткі склепаў, якіх было два, у малым знайшлі надмагільныя камяні, а пад імі — чалавечыя астанкі, — расказвае Алена Рудзінская. — На адным з камянёў захаваўся надпіс «Хрыстоў раб іерэй Аўрамій», а год быў вызначаны 1469. Гэта таксама доказ таму, што храм існаваў ужо ў XV стагоддзі. Аднак можна гэты факт і абвергнуць, калі выказаць здагадку, што на месцы царквы стаяў драўляны храм, у склепе якога хавалі памерлых першасвятароў. А ў вялікім склепе, паколькі храм абарончага тыпу, па ўсёй верагоднасці, захоўвалася ўзбраенне, харчовыя запасы, царкоўныя рэчы і каштоўнасці.

Паміж двума склепамі быў праход. Гады чатыры таму спрабавалі расчысціць малы склеп, каб дабрацца ў вялікі. Толькі гэта аказалася небяспечным: усё пачало сыпацца.

Чаго толькі ні даводзілася перажываць цагляным мурам! За сваю складаную гісторыю даўжынёю ў пяць ці шэсць стагоддзяў Маламажэйкаўская царква была і крэпасцю, і касцёлам, і ўніяцкім храмам. Не адну вайну перажыў гэты ўнікальны помнік! Міма праходзілі войскі шведаў, палякаў, французаў, немцаў...

Будаўнікамі храма лічыцца магнацкі род Мацкевічаў-Шкленскіх. У канцы XVI стагоддзя мужчынскае пакаленне роду перарываецца. Адна з дачок выходзіць замуж за пана Нарушэвіча, другая — за князя Андрэя Сапегу. Прадчуваючы набліжэнне уніі, спадчыннікі складаюць завяшчанне, у якім пацвярджаюць недатыкальнасць царкоўных маёнткаў і выказваюць пажаданне, каб царква заставалася праваслаўнаю і не была перададзена ў абвешчаную тады унію. Аднак, як бы гэтага ні хацелі, храм пераходзіць у рукі ўніятаў.

Вядомы імёны святароў Маламажэйкаўскай царквы ў сярэдзіне XVII стагоддзя — Лаўрэнцій і Феадосій Варатынскія. Падчас вайны Расіі з Рэччу Паспалітай на храм напалі казакі, разрабавалі Мураванку і забілі святара Феадосія.

— Не аднойчы на храм нападалі і разбуралі яго, — працягвае экскурсавод. — Асабліва Мураванка пацярпела ў 1706 годзе, калі праз гэтыя мясціны на Палтаву ішлі войскі Карла XII. Храм уразіў шведскага караля сваім велічным выглядам, і той, «любуючыся» царквою, дае распараджэнне абстраляць яе. Больш за стагоддзе храм стаіць у запусценні, пакуль па Кацярынінскім тракце, які пралягаў за тры кіламетры адсюль, з Вільні ў Гародню не ехаў Аляксандр I. Імператара таксама ўразіла Мураванка. Толькі ён па-іншаму выказвае свае пачуцці — загадвае адраманставаць царкву.

Маламажэйкаўская царква.

У XVIII стагоддзі, будучы ўніяцкім, храм практычна не функцыянуе. Пачынаючы з 1794 года, па волі мясцовага калятара, уладальніка Маламажэйкаўскага маёнтка Казіміра Кастравіцкага, Мураванкаўская царква стала рымска-каталіцкай. Аб вялікай уладзе Кастравіцкага над храмам сведчыць мармуровая пліта, умураваная ў сцяну. На ёй — прозвішча «спонсара» царквы на лацінскай мове. Ёсць меркаванне, што была тут яшчэ адна такая ж пліта, на якой увекавечана імя і заснавальніка царквы — Шымкі Мацкевіча-Шкленскага.

Вельмі пацярпела Мураванка падчас Першай сусветнай вайны, калі ў царкве ўтрымлівалі ваеннапалонных. Толькі невядома чыіх. Алтарная частка была пераўтворана ў месца, дзе захоўваўся правіянт. Гэта было «салодкае» месца для пацукоў, якія пагрызлі падлогу, сапсавалі сцены. Бясчынствавалі тут і ваеннапалонныя. Разбурылі агароджу, вароты, спалілі прыбудовы пры храме. Нават святатацтвавалі! Калі настаяцель храма Леў Савіцкі вярнуўся сюды ў 1920-я гады і заспеў царкву ў страшным становішчы, ён адразу пачаў клапаціцца аб яе аднаўленні. Вядома, што каштоўнасці храма (іконы, кнігі), якія на пачатку вайны былі эвакуяваны ў Маскоўскую епархіяльную кантору, назад не вярнуліся.

З 1924 па 1948 год храм быў каталіцкім. Пасля пачынаюцца гаданні на царкву, і храм закрываецца. Больш за чатыры дзесяцігоддзі ён выкарыстоўваецца як складское памяшканне. Мясцовыя жыхары расказваюць: Мураванка аказалася ў такім запусценні, што для тагачасных дзяцей яна была месцам для гульняў. З 1993 года царква зноў праваслаўная. Па выхадных днях і вялікіх святах тут рэгулярна праводзяцца богаслужэнні.

Храм незвычайнай прыгажосці амаль не страціў свайго першапачатковага выгляду. Царква ў гонар нараджэння Прасвятой Багародзіцы падобная да сярэднявечнага замак з чатырма вежамі па вуглах. На кожнай вежы — шматузроўневая сістэма байніц. Храм уяўляе сабой аднаапсіднае трохнефавае збудаванне. Сцены царквы зроблены ў тэхніцы гатычнай муроўкі з моцнай абпаленай цэглы-пальчаткі. Знешне Мураванка выглядае большай, чым унутры. А ўсё таму, што таўшчыня сцен дасягае 2 м, а падмурак — больш як 2,5. Паводле гістарычных звестак, да 1817 года ў сценах царквы быў таемны ход. Вядома, што Маламажэйкаўская царква не магла б выстаяць перад сур'ёзным войскам, але невялікія варожыя атрады ёй не пагражалі.

Падчас рэканструкцыі ў XIX стагоддзі да галоўнага фасада храма прыбудавалі прытвор. Таксама «падраслі» заходнія вежы, ва ўсходніх прыбралі лесвіцы, быў паніжаны дах, зроблены карнізы, павялічаны аконныя праёмы, з'явілася званіца.

Своеасаблівая канструкцыя перакрыццяў: спляценне статкаў і нярвюр зорчатых скляпенняў утвараюць трыкутнікі і ромбы розных абрысаў і велічыні. Сістэма гатычных скляпенняў характарызуецца вытанчанасцю і тонкім малюнкам.

Першапачаткова, каб увайсці ў царкву, трэба было пераадолець жалезныя дзверы (герсы). Аб іх зараз нагадвае праём у сцяне. А дугападобная арка, якая вянчае ўваход у храм, захавалася і сёння. Яна адразу прыцягвае ўвагу: зроблена з цэглы незвычайнай формы. Па ўсёй верагоднасці, кожную цэглу рыхтавалі ў адзіным экзэмпляры, каб яна адпавядала свайму месцу.

Кожная цэгла на арцы — мастацкі твор. Няўзброеным вокам можна заўважыць на ёй цікавыя адбіткі. А нагадваюць яны сляды ката ці сабакі. Верагодна, жывёлы пакінулі іх, калі цэгла сушылася на сонцы. Некаторыя кажуць, што гэта кляймо майстра.

— Скляпенні храма выкладзены фігурнай, нават ажурнай цэглай, — пераканана Алена Рудзінская. — Яе назва — каралеўская лілея. Гэта сімвал чысціні і бязгрэшнасці. У Францыі лілея — каралеўская кветка, цэгла ў форме якой таксама сустракаецца ў помніках архітэктуры. Гэта дае падставу меркаваць, што з нашымі беларускімі дойлідамі будавалі храм французы ці італьянцы.

Шмат легендаў і паданняў тоіць у сабе храм у Мураванцы. Пісьменнік Славамір Антановіч прысвяціў ім цэлую кнігу — «Здані Мажэйкаўскай крэпасці».

Сёння званы царквы быццам гавораць з людзьмі, з навакольлем. Нібыта заклікаюць звярнуць з дарогі, выйсці на станцыі і проста спыніцца. Для таго каб дакрануцца да мінулага, адчуць шматвяковую прыгажосць і задумацца, што час ідзе, а спадчына застаецца.

— Ці можа Маламажэйкаўская царква прэтэндаваць быць у спісе сусветнай спадчыны ЮНЕСКА?

На пытанне адказвае **намеснік начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Аксана СМАТРЭНКА:**

— У Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА могуць быць уключаны толькі гісторыка-культурныя каштоўнасці першай і нулявой катэгорый. Царква ў гонар нараджэння Прасвятой Багародзіцы, якая знаходзіцца ў Мураванцы, акурат і адносіцца да нулявой катэгорыі. Таму гэты аб'ект уключаны ў папярэдні спіс і разглядаецца Цэнтрам сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

— У храме запланаваны рамонтныя работы?

— Паколькі аб'ект культавы, яны праводзяцца рэгулярна. Абавязкі па правядзенні рамонтных работ ускладзены на ўласніка, ім з'яўляецца епархія. Разглядаецца гэта і ў маштабе вобласці і мясцовай улады. Міністэрства культуры толькі кантралюе гэтыя мерапрыемствы.

Вераніка КАНЮТА

■ Дыялогі з радзімазнаўцамі

...ВАЧЫМА ПРАШЧУРАЎ РАЗГЛЕДЗЕЦЬ ГІСТОРЫЮ АЙЧЫНЫ

Пра Анатоля Васільевіча Статкевіча-Чабаганава сёння шмат гавораць і пішуць. Чалавек, які многія гады настойліва, карпатліва збіраў звесткі пра даўнія роды, толькі ў самыя апошнія гады пачаў выступаць у друку. З'явіліся грунтоўныя публікацыі ў перыёдыцы. Найперш — у часопісах «Роднае слова» і «Полымя». Выйшаў шэраг прывабна афармленых, багатых на архіўную інфармацыю кніг па генеалогіі беларускай шляхты. Даследчык часта выступае на навуковых канферэнцыях, гісторыка-краязнаўчых чытаннях. Не толькі ў Беларусі, але і ў Маскве і Санкт-Пецярбургу.

Сярод зусім нядаўніх здабыткаў нашага земляка — выхад у свет чарговага тома з серыі «Летапіс беларускай шляхты» «Казановічы герба «Гржымала». Пра гэтую падзею і не толькі пра яе — гутарка са слынным радзімазнаўцам Анатолем Статкевічам-Чабаганавым.

— Што паслужыла нагодай менавіта для даследавання гэтага вядомага на Магілёўшчыне старажытнага роду?

— Справа ў тым, што прадстаўнікі роду Казановічаў пакінулі надзвычай яркія старонкі ў гісторыі Беларусі і Расіі. Адзін толькі факт, што шэсць сыноў Гаўрыіла Пятровіча Казановіча ўдзельнічалі ў Айчыннай вайне 1812 года, не можа не зацікавіць пісьменніка. Усе яны мужна змагаліся ў многіх бітвах — у Галіцыі, Саксоніі, Францыі. Узнагароджаны баявымі ордэнамі. Адзін з братоў загінуў пад Таруцінам.

Асабліва хачу адзначыць Аляксея і Гілярыя Казановічаў, паручнікаў Ахтырскага гусарскага палка, якія ўдзельнічалі ў Барадзінскай бітве. За смеласць у баях на Барадзінскім полі яны былі ўзнагароджаны залатой зброяй. Імя Гілярыя Казановіча «як кроў праліўшага» навечна выбітае на памятнай дошцы Храма Хрыста Збавіцеля ў Маскве. Пазней Аляксей і Гілярый сталі падпалкоўнікамі, «многіх ордэнаў кавалерамі».

Яшчэ адзін з сыноў Гаўрыіла Казановіча, Фёдар, стаў капітанам. Выйшаўшы ў адстаўку, жыў у Літоўска-Віленскай губерні, у Брэсцкім павеце. Досыць цікава склалася жыццё Васіля Гаўрылавіча Казановіча.

— Калі не памыляюся, актыўнага ўдзельніка партызанскага руху ў Айчынную вайну 1812 года?..

Барыс КАЗАНОВІЧ.

— Так. І пра гэта піша ў сваіх успамінах яго праўнучка Алена Казановіч. Яе прадзед у час вайны 1812 года «арганізаваў з сялян партызанскія атрады, дзейнічаў <...> смела і рашуча». Пра паручніка Казановіча ў сваім «Дзённіку партызанскіх дзеянняў» славуты Дзяніс Давыдаў таксама згадвае. У 1814 годзе Васіль Казановіч разам з рускімі войскамі ўваходзіць у Парыж. Наш зямляк быў узнагароджаны медалём «За ўзяцце Парыжа». Вярнуўся ў Расію з маладой жонкай, чароўнай французанкай Тэрэзіяй Колен.

— Ваша даследаванне прыадкрывае і той факт, што ў родзе Казановічаў — дзеячы розных ідэйна-палітычных арыентацый і памкненняў. Як прыклад — Барыс Ільіч Казановіч, вядомы рускі генерал, удзельнік грамадзянскай вайны, які зрабіў свой выбар на карысць белага руху...

— Лідзія Паўлаўна Казановіч (Язерская) належала да партыі эсэраў. Еўлалія Паўлаўна Казановіч — адна з заснавальніц Пушкінскага Дома, збіральнік фальклору Магілёўскай губерні. Унесла вельмі істотны ўклад у культуру Беларусі і Расіі. У томе «Казановічы герба «Гржымала» надрукаваны яе «Валачобныя песні» і «Гаворы Азеранскага края». Цікавы той факт, што Аляксандр Блок пакінуў у альбоме Еўлаліі Казановіч запіс са сваім апошнім вершам — прысвячэннем «Пушкінскаму Дому»...

— «Пушкин! Тайную свободу / Пели мы вослед тебе! / Дай нам руку в непогоду, / Помоги в немой борьбе!..»

— «Не твоих ли звуков сладость / Вдохновляла в те года? / Не твоя ли, Пушкин, радость / Окрыляла нас тогда?». Усё гэта — Блок. Пэўна ж, каб не Еўлалія Паўлаўна, то верша і не было б. «Вот зачем такой знакомый / И родной для сердца звук — / Имя Пушкинского Дома / В Академии наук».

Нягледзячы на рознасць ідэйных памкненняў, ва ўсіх Казановічаў была адна агульная рыса — вернасць абавязку, прытрымліванне якога надавала ім сіл у самыя цяжкія моманты жыцця. Як адзначае акадэмік Уладзімір Гніламёдаў, аналізуючы маю працу пра род Казановічаў, «палітычная скіраванасць наўрад ці адыгрывала ў іх жыцці і ўчынках галоўную ролю, найбольш вызначальнымі з'яўляліся традыцыі, мараль, стэрэатыпы мыслення, уяўленні аб «правільнасці». Перабіраючы многія і многія архіўныя дакументы, і я бачыў гэта: як кожны прадстаўнік роду Казановічаў браў ад папярэднікаў у спадчыну вопыт, жыццёвыя прынцыпы, традыцыі сям'і, яе ідэалы. Прадстаўнікі роду Казановічаў адыгралі прыкметную ролю ў расійскай гісторыі пачатку XX стагоддзя.

— І ў сваю чаргу, якраз у гэты перыяд сярод іншых Казановічаў вылучаецца генерал-лейтэнант Барыс Ільіч Казановіч...

— Яшчэ ў юнацтве, пасля таго, як прачытаў раман Аляксея Талстога «Блуканне па пакутах», мяне зацікавіў лёс аднаго з герояў гэтага рамана — генерала Казановіча. Аляксей Талстой, прыняўшы пасля эміграцыі савецкую рэчаіснасць і ўхваляючы яе, усё ж такі стварыў у рамане «Блуканне па пакутах» станоўчы вобраз белагвардзейскага генерала Казановіча. Пісьменнік захоплена, вобразна перадаў яго рашучасць, цвёрдасць характару і асабістую смеласць. На прыкладзе генерала Казановіча Талстой стварыў абагульнены вобраз афіцэра Добраахвотнай арміі, якая ідэйна супрацьстаіць Чырвонай Арміі, але з'яўляецца «механізмам паслухмянай волі адзінага камандавання». Да канца жыцця, знаходзячыся ў эміграцыі, генерал Казановіч быў старшынёй Галоўнага кіраўніцтва Саюза ўдзельнікаў 1-га Кубанскага паходу і Таварыства афіцэраў Генеральнага штаба ў Югаславіі.

— Мяркуючы і па новым томе з «Летапісу беларускай шляхты», і па папярэдніх кнігах серыі, зробленае вамі ўяўляе цікавасць не толькі для гісторыкаў, культуролагаў, але і для простага, шараговага чытача. Бо дазваляе сачыць не толькі за асобнымі звёнамі гісторыі аднаго роду, але і спрыяе ўяўленням пра жыццё асобных прадстаўнікоў шэрагу пакаленняў, а ў цэлым — і ўсяго грамадства.

— «Казановічы герба «Гржымала» — гэта гісторыя роду за пяцьсот гадоў, дапоўненая звесткамі пра родзічаў Казановічаў — Астроўскіх, Кігнах, Свянціцкіх, Эрэнбушах, Даненберг, Кануковых, Ушаковых і інш. Аднойчы мне давялося пазнаёміцца з дзённікавымі запісамі дачкі генерала Барыса Ільіча Казановіча — Алены. Яна эмігрыравала з Расіі ў час грамадзянскай вайны, а ў 1950-я вярнулася на радзіму. Дзякуй Богу, паспела выкласці на паперу цікавейшыя ўспаміны пра жыццё прадстаўнікоў сямейнай дынастыі Казановічаў, якія верай і праўдай служылі сваёй Айчыне, як яны яе разумелі, асэнсоўвалі з пакалення ў пакаленне. Учытаўшыся ў тэкст, я зразумеў, што гэтыя дзённікі павінны ўбачыць свет, прыйсці да чытача. Успаміны Алены Казановіч удала дапаўняюць гісторыю роду Казановічаў і, несумненна, з'яўляюцца значным укладам у мемуарную літаратуру.

Нельга абысці ўвагай і той факт, што сям'я Алены Казановіч выратавала і захавала абраз праведнай Багародзіцы Магілёўска-Брацкай, які ў жніўні 1995 года быў вернуты гораду Магілёву і зараз знаходзіцца ў Магілёўскім Свята-Нікольскім манастыры.

— Ці не падаецца вам часам, што ў вашых кнігах занадта вялікая колькасць ілюстрацыйнага матэрыялу, выяў гістарычных дакументаў, старых фотаздымкаў...

— Але гэта мая наўмысная пазіцыя. Стараюся кожны факт пацвердзіць дакладнымі архіўнымі звесткамі. Напрыканцы кнігі дадзены імянныя паказальнікі да радаслоўных, геаграфічны паказальнік, слоўнік гістарычнай лексікі, спіс умоўных скарачэнняў.

— Вы акрэслілі перад сабою няпростую задачу — асэнсаваць гісторыю Айчыны праз гісторыю канкрэтнага роду...

— Памяць пра мінулае паступова знікае, калі даўнія падзеі не зафіксаваць, не занатаваць. «Як жылі нашы прашчуры? Да чаго яны імкнуліся? Кім былі?» — такія пытанні бясконцыя. І мне падаецца, што іх вырашэнне, пошук адказаў на іх — гэта ж надзвычай цікава для гістарычнай навукі. Важна ўбачыць вачыма прашчураў сапраўдную, непалітызаваную гісторыю сваёй краіны, зберагчы і захаваць сваю веру, культуру, а ў выніку — сваю Айчыну.

За дваццаць гадоў работы даследавана больш як сорак вядомых шляхетных родаў Беларусі, у асноўным маіх прашчураў: Сацкевічаў-Статкевічаў, Карафа-Корбутаў, Рудзінскіх, Тычына, Ждановічаў-Гурыновічаў, Сыцько, Ліпскіх, Забела, Татураў, Некрашэвічаў, князёў Глінскіх і Ліхадзіеўскіх, Рэутаў, Карыбут-Дашкевічаў, Кернажыцкіх, Мастволовічаў, Геталтаў і Тышкевічаў з роду Каленікавічаў, Крукоўскіх, Макавецкіх, Пількевічаў, Забродскіх, Корзунаў, Ушынскіх, Казановічаў, Астроўскіх, Кігнаў, Касынскіх, Курчэвічаў з Сотвы, Сеўрукоў, Астрэйка, Тарасевічаў, Кавецкіх, Бербашоў

Еўлалія КАЗАНОВІЧ.

(Юхновічаў-Бербашоў, Юхновічаў), Францкевічаў-Радзімінскіх, Галінскіх, Іваноўскіх, Смольскіх, Слонскіх, Жаўрыдаў, Мрачынскіх, Бучынскіх, Скарына і іншых.

Перакананы, што даследаванне гісторыі жыцця кожнага канкрэтнага чалавека, а следам і канкрэтнага роду, усталяванне сувязяў паміж прадстаўнікамі многіх родаў за некалькі стагоддзяў дае магчымасць значна дапоўніць эпічную карціну жыцця грамадства, адчуць, што нас з мінулым звязвае першапачатковая повязь і непарушная роднаснасць. Важна зразумець, што хаця некаторыя прадстаўнікі роду і знаходзяцца ў забыцці, але ж яны ў свой час жылі, кахалі, выхоўвалі дзяцей, займалі важныя дзяржаўныя пасады, уплывалі на ход гістарычных падзей і лініі чалавечых лёсаў.

Гутарыў Мікола МІРШЧЫНА

■ 100 славутых прозвішчаў Беларусі

ЯГАЙЛЫ

Ягайла — вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага і славуты кароль Польскага каралеўства

Імя *Ягайла* не сустракаецца ў цэрашнім іменаслове беларусаў. Нашаму сучаснику яно больш вядома з гістарычнай літаратуры, якая распавядае пра падзеі даўно мінулых часоў — 2-й паловы XIV — 1-й паловы XV стагоддзяў. Менавіта на гэты перыяд (1347 год, па іншых звестках 1352 — 1434гг.) прыпадае жыццё і дзейнасць Ягайлы — вялікага князя Вялікага Княства Літоўскага і караля польскага, заснавальніка славутай дынастыі Ягелонаў. 48-гадовы перыяд валадарства Ягайлы пакінуў значны след у палітычным, эканамічным і культурным жыцці дзвюх дзяржаў — Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы. Адной з найважнейшых падзей, што ўвайшлі ў гісторыю нашай краіны, было заключэнне Ягайлам у 1385 годзе пагаднення паміж ВКЛ і Польскім каралеўствам, у выніку якога ўзнікла адзінае дзяржаўнае ўтварэнне з поўнай палітычнай і дзяржаўнай незалежнасцю ВКЛ. Гэтае пагадненне нам вядома пад назвай Крэўская унія — ад назвы старажытнага беларускага мястэчка Крэва (сучасны Смаргонскі раён Гродзенскай вобласці), у якім у той час знаходзілася рэзідэнцыя вялікага князя ВКЛ. Ажаніўшыся ў 1386 годзе з польскай каралевай Ядвігай, Ягайла быў выбраны каралём Польшчы і паўторна ахрышчаны ў каталіцтва пад імем Уладзіслаў. Ягайла імкнуўся далучыць да рымска-каталіцкай царквы ўсіх сваіх падданых, і не толькі язычнікаў, але і праваслаўных. Так, у 1387 годзе правёў масавае хрышчэнне жыхароў Віленшчыны, знішчыўшы іх язычніцкія фетышы, у тым ліку і непагасны агонь Перуна. Заснаваў Віленскую рымска-каталіцкую епархію для Літвы і Беларусі. Ягайла лічыцца і заснавальнікам аднаго з першых на беларускіх землях каталіцкіх касцёлаў — у вёсцы Абольцы цяперашняга Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. Кароль быў вядомы і сваімі вайсковымі поспехамі: падчас славутай Грунвальдскай бітвы (15 ліпеня 1410 года) ён быў галоўнакамандуючым войска, якое налічвала каля 32 тысяч чалавек. Перамога над крыжакамі ў гэтай бітве мела лёсавызначальнае значэнне для многіх народаў Еўропы: спыненне агрэсіі Тэўтонскага ордэна садзейнічала эканамічнаму развіццю многіх еўрапейскіх краін. Не менш значны ўклад быў унесены Ягайлам і ў навукова-культурнае жыццё еўрапейскіх зямель: у 1400 годзе ім быў адноўлены і рэарганізаваны на ўзор Парыжскага ўніверсітэта Кракаўскі ўніверсітэт (заснаваны ў 1364 годзе Казімірам III). З таго часу адна з найстаражытнейшых еўрапейскіх навучальных устаноў — Кракаўскі ўніверсітэт — стаў называцца Ягелонскім універсітэтам.

Паходжанне прозвішча

Імя *Ягайла* ў гістарычных помніках сустракаецца ў розных пісьмовых варыянтах: *Ягайло, Якгайло, Jagel, Jagalo, Jagailo*. Адназначнага тлумачэння гэтага імя няма, існуе некалькі гіпотэз — хрысціянская, літоўская, скандынаўская, заходнебалцкая. Адна з першых спроб растлумачыць паходжанне імя *Ягайла* належыць расійскаму вучонаму У. Юргевічу. У сваёй публікацыі «Опыт объяснения имён литовских князей», надрукаванай у 1883 годзе ў навуковым часопісе «Чтения в императорском обществе истории и древностей российских», У. Юргевіч патлумачыў сувязь імені *Ягайла* з хрысціянскім праваслаўным імем *Якаў*. Сучасны беларускі гісторык В.Чаропка ў працы «Паходжанне і радавод вялікіх князёў літоўскіх» імя *Ягайла* звязвае з імем *Іаган*.

Літоўскія вучоныя паходжанне імя *Ягайла* (па-літоўску *Jogaila*) выводзяць ад слоў *joti* (ехаць конна) і ўстарэлага *gailas* («моцны»), што азначае «добры яздок». У літоўскай гістарыяграфіі XIX стагоддзя існуе і іншае тлумачэнне: ад слоў jei («калі») і *gailis* «жаль», што літаральна азначае «калі жаль». Гэтыя тлумачэнні большасцю навукоўцаў разглядаюцца як неверагодныя.

Непраўдападобным з'яўляецца і тлумачэнне імя *Ягайла* (варыянт *Ягела*) ад слова *ягель* «лішайнік, які служыць зімой кормам для паўночных аленяў». У старажытнасці сапраўды была распаўсюджана традыцыя даваць імёны дзецям па назвах раслін. Такая традыцыя цалкам адпавядала ўяўленням старажытнага чалавека аб навакольным свеце. Даючы такое імя, бацькі хацелі, каб прырода ўспрымала дзіця як свайго і надзяліла яго тымі карыснымі якасцямі, якія належалі аднайменнаму прадстаўніку расліннага свету. Аднак *ягель* — расліна, якая расце ў тундры, а таму выводзіць паходжанне ад назвы неўласцівай для нашых зямель расліны не зусім лагічна.

У беларускай гістарычнай навуцы існуе версія (Л. Галяк), паводле якой частка імені *Ягайла* — *«гайла»* выводзіцца са скандынаўскіх моў, у якіх ёсць слова *geled* у значэнні «чын», «становішча» і слова *gal* у значэнні «злосны», «шалёны». Першая літара «я-» ў складзе імя тлумачыцца як «але».

Іншае меркаванне адносна паходжання імя *Ягайла* выказваецца ў кнізе «Старажытныя ліцьвіны» (аўтар П.Урбан): пры тлумачэнні элемента «-гайла» праводзіцца паралель з індаеўрапейскім словам *gail*, якое ўжывалася ў значэнні «высакародны», «заўзяты», «магутны», «палкі», «светлы», «слаўны», кельцкім *g(h)al* «магчы», стараверхнянямецкім *helid* «герой», стараірландскім *giall* «высакародны нашчадак», сярэдневерхненямецкім *geil (gail)* «бадзёры», «вясёлы», «гарэзлівы», «жвавы», «палкі», старапрускім *gaylis* «белы», «светлы». У сувязі з гэтым імя Ягайла, на думку вучонага, азначала «Вялікі славай» або «Светлы славай».

Падобнае тлумачэнне прыводзіць і гісторык беларускай літаратуры А. Бразгуноў у артыкуле «Генезіс імёнаў вялікіх князёў літоўскіх»: аўтар дапускае, што першая аснова імені можа ўзыходзіць да стараверхненямецкага *hoge* «важны», «высокі», «вялікі», «высакародны» або да стараверхненямецкага *huge, hugen* «дух», «душа», «думка», «розум». Другая аснова ўзыходзіць да індаеўрапейскага *gail*. У гэтым кантэксце даследчык лічыць, што імя магло азначаць «Высокі славай» або проста «Высакародны».

Сучасныя Ягайлы: хто яны — нашчадкі караля або аднафамільцы?

Вялікі князь літоўскі і кароль Польскага каралеўства памёр на 86-м годзе жыцця. Меў чатырох жонак: Ядвігу, Ганну Цэлескую, Альжбету Граноўскую, Соф'ю Гальшанскую. У шлюбе з Соф'яй Гальшанскай меў сыноў Уладзіслава і Казіміра. Уладзіслаў у 10-гадовым узросце стаў каралём Польшчы (1434 год), а ў 15-гадовым — Венгрыі (1440 год). Другі сын Казімір быў вялікім князем літоўскім (1440 год) і каралём Польшчы (1447 год). Сярод нашчадкаў Ягайлы былі і іншыя знакамітыя асобы (Ягелоны, Ягайлавічы): кароль Чэхіі (1471 год) і кароль Венгрыі (1490 год) Уладзіслаў II, кароль Польшчы (1492 год) Ян I Ольбрахт, вялікі князь літоўскі (1492 год) і кароль польскі (1501 год) *Аляксандр Казіміравіч*, вялікі князь літоўскі і кароль польскі (1506 год) Жыгімонт, кароль Чэхіі і Венгрыі (1516 год) Людовік II, вялікі князь літоўскі (1544 год) і кароль польскі (1548 год) Жыгімонт Аўгуст. Шматлікія еўрапейскія арыстакратычныя сем'і, некаторыя з цяперашніх еўрапейскіх каралёў і князёў, а таксама дынастыі, што страцілі трон падчас рэвалюцый XIX і XX стагоддзяў адносяцца да Ягайлавічаў, нашчадкаў славутага караля.

У наш час прозвішча *Ягайла* сустракаецца на тэрыторыі Літвы (Jogaila), Польшчы (Jagiello) і Украіны (Ягайло). На беларускіх землях прозвішча Ягайла не зафіксавана, але неаднаразова сустракаецца яго фанетыка-арфаграфічны варыянт *Ягела* (*Брэсцкая вобласць:* Баранавіцкі, Лунінецкі раёны; *Гродзенская вобласць:* Ваўкавыскі, Лідскі раёны; *Гомельская вобласць:* Брагінскі раён; *Магілёўская вобласць:* Клічаўскі раён; *Мінская вобласць:* Вілейскі, Слуцкі раёны; *Віцебская вобласць:* Пастаўскі, Браслаўскі раёны) і роднаснае з ім прозвішча *Ягаловіч* (*Мінская вобласць:* Вілейскі, Маладзечанскі раёны).

На тэрыторыі Беларусі існуюць тры населеныя пункты, у аснову назваў якіх падзелена імя Ягела (Ягайла): *в. Ягелы* (Воранаўскі раён Гродзенскай вобласці), *в. Ягелаўшчына* (Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці), *в. Ягелевічы* (Іванцевіцкі раён Брэсцкай вобласці).

Ігар КАПЫЛОЎ, кандыдат філалагічных навук, вучоны сакратар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 12.09.2012 г. в 10:00 по адресу: 210600, г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, конференц-зал.

Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Витебского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

Лот 1. Помещение 1-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 69,7 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 17,425 базовых арендных величин; размер задатка – 1,7425 базовых арендных величин; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли, коэффициент (п.8.2 Указа № 150) составляет 3,0.

Лот 2. Помещение 1-го этажа в изолированном помещении, расположенном по адресу: ул. Богдановича, 10, пом. 2 в г. Полоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 8,64 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 2,16 базовых арендных величин; размер задатка – 0,216 базовой арендной величины; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли, коэффициент (п. 8.2 Указа № 150) составляет 3,0.

Документы на участие в аукционе принимаются с 9.08.2012 г. по 11.09.2012 г. в рабочее время (с 9:00 до 17:00) по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п. Документы, поданные после 17:00 11.09.2012 г., не рассматриваются. Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9:00 до 10:00 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с № 3012072841543 в филиале № 200 – Витебском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300977657, Витебский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Срок заключения договора аренды: в соответствии с действующим законодательством.

Телефоны для справок: (0212) 27 29 42, 27 11 58, факс (0212) 27 18 81.

Открытое акционерное общество «Пивзавод Оливария»
220029 г. Минск, ул. Киселева, дом 30

ОАО «Пивзавод Оливария» извещает своих акционеров о проведении внеочередного собрания акционеров ОАО «Пивзавод Оливария», которое состоится 30 августа 2012 года в 10-00 в выставочном зале ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: город Минск, ул. Киселева, дом 30.

Форма проведения внеочередного собрания акционеров – очная.

Повестка дня внеочередного собрания акционеров:

1. Одобрение сделок, в совершении которых имеется заинтересованность аффилированного лица.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном собрании акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» 30 августа 2012 года, составлен на основании реестра акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» по состоянию на 20 августа 2012 года.

Материалы к внеочередному собранию акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» 30 августа 2012 года будут представлены для ознакомления акционерам с 23 августа 2012 года на информационном стенде в административном здании ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: г. Минск, проспект Машерова, дом 19.

Регистрация акционеров для участия во внеочередном собрании ОАО «Пивзавод Оливария» будет осуществляться 30 августа 2012 года с 8-50 до 9-50 в выставочном зале ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: город Минск, ул. Киселева, дом 30. Регистрация проводится при предъявлении документа, подтверждающего полномочия на участие в собрании (доверенность) и/или паспорта.

УНП 100128525

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 21.08.2012 г. в 10:00 по адресу: 210600, г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, конференц-зал.

Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Витебского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

Лот 1. Помещение 3-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 27,9 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 6,975 базовых арендных величин; размер задатка – 0,6975 базовой арендной величины; целевое использование – для производственных площадей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, коэффициент (п.8.2 Указа № 150) составляет 2,5.

Документы на участие в аукционе принимаются с 9.08.2012 г. по 20.08.2012 г. в рабочее время (с 9:00 до 17:00) по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п. Документы, поданные после 17:00 20.08.2012 г., не рассматриваются. Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9:00 до 10:00 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с № 3012072841543 в филиале № 200 – Витебском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300977657, Витебский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Срок заключения договора аренды: в соответствии с действующим законодательством.

Телефоны для справок (0212) 27 29-42, 27 11 58, факс (0212) 27 18 81.

Первоначально извещение о проведении открытого аукциона опубликовано в газете «Звязда» № 85 от 5.05.2012 г.

Уважаемые акционеры ОАО «Дрожжевой комбинат»
24 августа 2012 года в 14.00 проводится
внеочередное общее собрание акционеров
ОАО «Дрожжевой комбинат» по адресу:
г. Минск, ул. Октябрьская, 14.

Повестка дня:

1. О внесении изменений в устав Общества.

Регистрация участников собрания будет производиться с 13.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность, а для представителей акционеров – по доверенности.

Администрация.
Наблюдательный совет.

УНП 100104781

ХАТЕЖИНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

проводит тендер по ремонту административного здания.

Контактные телефоны:
502 31 12 – бухг.
502 31 67 – председатель
А.С. Суглобов

Извещение об отказе в проведении торгов по конкурсу имущества ОАО «Гроднооблавтотранс»

Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей в соответствии со ст. 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь извещает об отказе в проведении торгов по конкурсу имущества ОАО «Гроднооблавтотранс». Информация о проведении торгов была опубликована в газете «Звязда» № 149 (27264) от 4 августа 2012 года.

Телефон для справок: 8 (0152) 74 22 27.

УНП 500481906

РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 24 августа 2012 г.
АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА УП «Барановичская СПМК-10»

Номер лота	ЛОТ № 1
Наименование объекта	Автокран КС-3579-4, 2009 года выпуска (инв. № 0110)
Местонахождение объекта	Брестская обл., г. Барановичи, 2-й пер. Вильчковского, 42
Продавец (Балансодержатель)	Государственное унитарное специализированное строительное предприятие «Барановичская СПМК-10»
Организатор торгов	РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление
Начальная цена продажи, руб. без НДС	449 522 918
Размер задатка, руб.	44 952 292
Тип и характеристика объекта	Автокран КС-3579-4, 2009 года выпуска (инв. № 0110), цвет желтый Кузов Y3M5337A290001475
Условия продажи	Аукцион без условий
Условия оплаты	Согласно договора купли продажи
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012105618108 руб.РБ в рег. дирекции № 700 ОАО «БПС-СберБанк» по г. Минску, код 369, УНП 102353509

Аукцион состоится 08 августа 2012 г. в 11.00 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».

2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица)

4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**** Участник аукциона, выигравший торги (покупатель), оплачивает продавцу НДС в размере 20% от продажной цены объекта, а также уплачивает вознаграждение «Поверенному».***

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
Последний день приема заявлений – 23.08.2012 г. до 17.00.
Контактный тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81

Извещение о проведении 10 сентября 2012 года торгов
по продаже имущества ОАО «Мехколонна № 93»

Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)	- Лит. А1/к административный корпус (здание административно-хозяйственное) общей площадью 340 кв. м, инвентарный номер 500/С-16427; - Лит. Б1/к склад-гараж (здание многофункциональное) общей площадью 261 кв. м, инвентарный номер 500/С-16428.
Сведения о земельном участке	площадь 0,5033 га, кадастровый номер 500000000004003641, назначение: для эксплуатации и обслуживания административного здания и здания склада-гаража
Як адзначае гаспадар Аляксандр Перажко, сёння турысты мяняюцца, яны просяць «толькі не рабіць у дамках ніякіх «еўра». Моднай становіцца проста вясковая атмасфера, тое, што для гарадскіх жыхароў — ужо амаль экзотыка. На жаль, гэта можна назіраць нават і ў многіх сучасных сядзібах. Гасцям сядзібы даспадобы проста памакаць блінам у мачанку на патэльні ці пасядзець каля старажытных дубоў, пахадзіць басанож па траве, выправіцца на рэчку. А калі хочацца нечага яшчэ — калі ласка! Тут арганізуюць і паляванне, і сафары (можна выбрацца пафатаграфаваць дзікіх жывёл), рыбалку, сплавы па рацэ, язду на конях. Гаспадары наладзілі кантакты з людзьмі, з якімі можна працаваць па арганізацыі вольнага часу турыстаў. Ды і вяскоўцы пачалі актыўна ўцягвацца: напрыклад, на Вялікдзень самі забіраюць турыстаў, вядуць да сябе ў госці, адорваюць чырвонымі яйкамі, гуляюць у біткі. Улетку вясковы дзядок можа падзарабіць экскурсаводам — пасадзіць на воз турыстаў і павезці на агляд мясцовасці, а гаспадары сядзібы яшчэ і «ссабойку» турыстам у дарогу зладзяць — з салам, агуркамі.

— Мясцовым падабаецца, што сюды зачасцілі турысты, — расказвае Аляксандр. — Вёска ж паміралa. Бабулька, якая жыве па суседстве, так нам і сказала: калі б не мы, невядома, што б яна адна тут рабіла. Зараз у вёсцы ёсць дзве маладыя сям'і з дзеткамі, і ніхто ўжо адсюль з'язджаць не збіраецца. Людзі пачалі фермерствам займацца. Бабулькі ведаюць, што турысту можна прадаць бульбачкі ці яшчэ чаго з уласнага агарода. У нас ужо і дарога накатана — усе мясцовыя тут ездзяць, а па вёсцы дарога зарасла. Зноў жа, калі каму якая патрэбна дапамога (па гаспадарцы, альбо ў горад у бальніцу адвезці, ці яшчэ што), усе вяскоўцы звяртаюцца да нас...

Сёння Аляксандру 27 гадоў, а калі ён (разам з кампаньёнам) толькі пачаў займацца агратурызмам, было 22. Хлопцам нават з насяродагай давалі крэдыт: баяліся, ці справяцца. І тым не менш менавіта яны самымі першымі рызыкнулі ўзяць крэдыт на максімальна магчымую суму... І сёння прыбыткова працуюць. Але асноўным сакрэтам поспеху лічаць усё ж... стасункі паміж людзьмі.

— Зносіны з людзьмі — гэта першае, што павінна быць у сядзібе, а не архітэктура, не кухня, не пакоі-«люкс», — упэўнены Аляксандр. — Мы спрабавалі пакінуць сядзібу на іншых, але ўбачылі, што справы пайшлі на спад, турыстам трэба ўдзяляць увагу.

Кантора становіцца гасцініцай

Толькі заходзіш за вароты сядзібы «Бабраняты», што недалёка ад Мазыра, і адразу бачыш помнік Калініну. Ды і ў будынку перыядычна трапляюцца рэчы, што нагадваюць пра савецкую эпоху. Тут можна пабачыць і проста цікавыя рэчы з вясковага побыту. Ёсць нават шыкоўная калекцыя самавараў, якія гаспадар плануе выкарыстоўваць непасрэдна па прызначэнні — ставіць на сталы, за якімі сабраліся турысты.

Дарэчы, з калекцый самавараў аграсядзіба і пачалася. Як гаворыць гаспадар Віктар Крыцкі, калекцыю хацелася паказаць людзям, а выставіць не было дзе, вось і ўзяліся сужэнцы за агратурызм. Гэта, вядома, гаспадар кажа жартам, насамрэч ідэя зрабіць дамок, у якім прымаць турыстаў, у Крыцкіх з'явілася яшчэ задоўга да таго, як у Беларусі пачаў развівацца агратурызм. Пра такі бізнэс яны даведаліся, калі былі за мяжой.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Сядзіба «Свіднае».

ШАНЦ НА ВЫЖЫВАННЕ

З кожным годам колькасць аграсядзіб на Беларусі павялічваецца. Так, калі ў 2006 годзе іх было ўсяго тры дзясяткі, то сёння дамкоў на вёсцы, гатовых прыняць турыстаў, ужо больш за паўтары тысячы. А да 2015 года плануецца, што такіх аб'ектаў будзе ўжо каля трох тысяч. Інфармацыю аб аграсядзібах ужо можна знайсці не толькі на адпаведных старонках у інтэрнэце, на турыстычных выставах, але і на многіх сайтах райвыканкамаў. Гаспадары сядзіб актыўна ўзамадзейнічаюць з мясцовымі органамі ўлады, тут ладзяцца семінары і канферэнцыі.

Сядзібы сёння прапануюць не толькі начлег і харчаванне. Паляпшаецца сэрвіс, гаспадары ўсё часцей задумваюцца і над тым, чым заняць турыста. Дзякуючы іх ініцыятыве ладзяцца вясковыя святы, кірмашы, адраджаюцца абрады. Доктар архітэктуры, прафесар, загадчык кафедры жылых і грамадскіх збудаванняў БНТУ Сяргей СЕРГАЧОЎ адзначае: «Агратурызм дае шанц захавацца пэўным аб'ектам гісторыка-культурнай спадчыны, традыцыям. Мяне вельмі радуе, што гаспадары сядзіб збіраюць старажытныя рэчы. Гэтыя прадметы могуць працягнуць сваё існаванне, прычым, што важна, яны застаюцца ў той мясцовасці, дзе ствараліся. Акрамя таго, чалавек, які прыехаў адпачыць у сядзібу, можа ўзяць у рукі такую рэч, чаго не зробіш у музеі. Я ўпэўнены: пройдзе некаторы час, і гаспадары сядзіб усё больш будуць думаць аб тым, што яны павінны быць прадстаўнікамі пэўнай тэрыторыі, мясцовы фактар (ва ўсім — культуры, харчаванні, пабудовах) будзе ўсё больш падавацца, разыгрывацца. Агратурызм — магчыма, адзіны шанц для вёсак, якія размешчаны ў глыбінцы, працягнуць сваё існаванне. Аўтэнтыка — гэта таксама тавар, які можа прадавацца. Важна, каб мясцовыя ўлады разумелі каштоўнасць гэтага. Можа, у вёсках павінна быць разгорнута праграма па стварэнні на базе старых пабудоў дамоў памяці, дзе захаваюцца старая архітэктура, этнаграфія, там будуць праводзіцца фальклорныя мерапрыемствы. Такая праграма можа быць пад патранажам мясцовых улад, школ, клубаў і нават царквы. У дамах памяці могуць захоўвацца фатаграфіі і дакументы калгаснага перыяду, ваенныя дакументы, старыя рэчы. Раённы музей далёка, а тут усё гэта служыла б людзям. І самі вяскоўцы, і турысты збіраліся б тут, глядзелі, узгадвалі».

АПОШНІ ПРЫТУЛАК

Сельскія могілкі ў Магілёўскай вобласці застаюцца клопатам мясцовых Саветаў, а ў Чэрыкаўскім раёне прыдумалі, як падзяліць гэты клопат на ўсіх.

СПРЭЧНЫЯ МОГІЛКІ

На апошнім прыёме грамадзян у старшыні Магілёўскага аблвыканкама Пятра Рудніка прагучала вышэйназваная тэма: крычавец Георгій Вішнеўскі хоць і жыве ў раённым цэнтры, але дбае пра родную вёску Паклады і яе старыя могілкі.

— Неахайна зрабілі агароджу на могілках, а 30-метровыя сосны, відаць, хутка паваляцца, — скардзіўся мужчына кіраўніку вобласці. — А карэнных жыхароў, чые родзічы на тых могілках ляжаць, засталося зусім мала, і няма каму даглядаць, крыўдна...

Пры разборы праблемы з удзелам старшыні раённага Савета дэпутатаў аказалася, што могілкі ў Пакладах зусім не закінутыя. На ўсіх месцах пахавання традыцыйна ўвесну, напярэдадні Радаўніцы, прыбіраецца смецце і наводзіцца парадак. Акрамя гэтага, яшчэ ў маі на могілках у Пакладах працавалі людзі, якіх накіраваў цэнтр занятасці. Могілкі месцяцца практычна ў лесе, таму там сапраўды шмат дрэў. Але ліквідавалі толькі некалькі «аварыйных». Астатнія небяспекі не ўяўляюць і нікому не перашкаджаюць. У доказ сваіх слоў мясцовае кіраўніцтва прад'явіла фотаздымкі.

Тым не менш, улічваючы скаргу чалавека, Пётр Руднік даручыў крычаўскім уладам яшчэ раз звярнуць увагу на сельскія могілкі. У прыватнасці, на могілках у Пакладах зноў карпатліва навесці парадак, але менавіта з удзелам мясцовых жыхароў: паводле прынцыпу, самі прыбяруць — не будуць засмечваць.

ТРАДЫЦЫІ І ПАРАДАК

У Чэрыкаўскім раёне 91-ы могілкі, прычым 25 з іх месцяцца ў так званай «зоне», адкуль пасля чарнобыльскай аварыі адсялілі жыхароў. Людзі прыязджаюць на такія могілкі звычайна раз на год, і догляд за імі, так ці інакш, кладзецца на мясцовыя ўлады.

— Вось ад гэтай праблемы мы калісьці і крочылі, — расказвае па парадку старшыня Чэрыкаўскага раённага Савета дэпутатаў Наталля Гатоўчык. — Рашэннем райвыканкама мы «замацавалі» могілкі за арганізацыямі і прадпрыемствамі горада і ўсяго раёна. Колькасць — у залежнасці ад магчымасцяў і магутнасцяў. Усе ўспрынялі такі крок нармальна: не цяжар, а неабходнасць.

Гэта адбылося ў 2005 годзе, і з тых часоў сістэма дзейнічае спраўна.

— Разумееце, сельскае насельніцтва старэе, — тлумачыць Наталля Раманаўна. — Вяскоўцы звычайна прыбіраюць толькі магілкі сваякоў. А астатнія як? Могілкі павінны быць прыбраныя!

Генеральная ўборка могілак, вядома, прызначаецца на вясну. Ствараюцца камісіі ў раёне і рабочыя групы ў сельсаветах, якія сочаць, каб да Радаўніцы могілкі выглядалі прыстойна. На месцах за гэтым прыглядаюць старасты вёсак і сельскія камітэты.

Старшыні сельсаветаў накіроўваюць лісты да кіраўнікоў арганізацый, дзе звяртаюцца да іх з афіцыйнай просьбай дапамагчы ў прыбіранні могілак. Гэта, хутчэй, знак павагі да памочнікаў, чым напамін, таму што ў Чэрыкаўскім раёне ўсе добра ведаюць свае абавязкі.

— Звычайна працоўны дэсант прыязджае ў вёску ў выхадны дзень, — расказвае старшыня райсавета. — Перад гэтым сельскі Савет робіць аб'яву і мясцовым жыхарам, каб яны прыйшлі і, вядома, зрабілі свой уклад у агульную справу. Потым даводзіцца вяртацца і пасля Радаўніцы, каб прыбраць смецце.

Наступнае прыбіранне на могілках плануецца на восень, каб навесці парадак перад Дзядамі: вынесці лісце і падрэзаць галіны на дрэвах. Талакой вырашаюцца і іншыя праблемы: аварыйныя дрэвы, агароджы і іншыя.

ВЁСКІ НЯМА, МОГІЛКІ ЁСЦЬ

Шэфы падключаюцца ў надзвычайных сітуацыях. Напрыклад, ураган паклаў дрэвы на могілках у вёсцы Глінь. Гэта была вялікая праца, якую вялі метадам народнай будоўлі. Пры моцным бураломе, што цікава, ніводная магіла не пацярпела, а вось над навядзеннем парадку давялося шмат папрацаваць: векавыя ліпы распілоўвалі і выносілі з могілак.

— Сярод вельмі адказных шэфаў хочам асабліва адзначыць Чэрыкаўскі лясгас, якім кіруе Міхаіл Касмачоў, — сказалі ў раённым Савеце дэпутатаў.

Старшыня Верамейскага сельскага Савета Віктар Іванькоў цяпер займаецца добраўпарадкаваннем могілак у вёсцы Каменка. Драўляная агароджа стала трухлявай і падлягае замене. Між тым, у гэтай вёсцы засталася толькі адна жыхарка, і бабуля свой уклад у агульную справу можа зрабіць толькі добрымі словамі.

— У нас ёсць і такія вёскі (іх некалькі), дзе ўжо няма ніводнага чалавека. Людзі пайшлі ў лепшы свет, а могілкі засталіся, і за імі трэба даглядаць, — гаворыць Віктар Пятровіч.

З гэтым дапамагаюць шэфы. Напрыклад, за мясцовым свінакомплексам «Светлы» замацаваны аж 6 могілак. Што ж, гэта буйное сельскагаспадарчае прадпрыемства, аб'яднанае з іншымі гаспадаркамі, тут працуюць 400 чалавек.

— Яны з разуменнем ставяцца, — каментуюць у Савеце. — Гэта для ўсіх даніна павагі да продкаў.

Да таго ж на тэрыторыі Верамейскага сельсавета ёсць 8 месцаў вайсковых пахаванняў, якія таксама патрабуюць клопатаў.

— Ведаеце, у нас сістэма адпрацаваная, і праблем тут не ўзнікае, — гаворыць Віктар Іванькоў. — У нас самыя вялікі могілкі — у Нарках. Тут было раней вялікае паселішча, якое нават называлі Кітай-горадам. Але цяпер тут крыху больш за 70 жыхароў, а могілкі дапамагаюць прыводзіць у парадак аддзяленне «Беларусбанка» і нават вашы калегі, рэдакцыя газеты «Веснік Чэрыкаўшчыны».

ФАРМАЛЬНА І РЭАЛЬНА

Сёння на балансе сельскіх Саветаў Чэрыкаўскага раёна стаяць толькі агароджы могілак. Калісьці, улічваючы занядбаны стан агароджаў, на ўсіх могілках зрабілі іх інвентарызацыю, а потым рамонт, дзе гэта было магчыма, альбо ўсталявалі новыя агароджы. Зноў-такі, з дапамогай мясцовых арганізацый і прадпрыемстваў. Цяпер, калі агароджы трэба рамантаваць (асабліва там, дзе яны драўляныя, а не металічныя ці жалезабетонныя, як на пяці могілках у «зоне»), то работы выконваюцца за кошт суботнікаў.

А вось самі па сабе могілкі — на паперы нібыта безгаспадарныя. На месцах тлумачаць, што так і не знайшлі ў заканадаўчых актах прамога ўказання аб перадачы месцаў пахавання спецыялізаваным арганізацыям. Ды і гавораць, што ў мясцовых камунальнікаў не хопіць сіл, тэхнікі і сродкаў на тое, каб навесці парадак на ўсіх 91 могілках! Таму ў Чэрыкаўскім раёне працягвае дзейнічаць прынцып «размеркавання клопату». І насамрэч, могілкі ў раёне заўсёды выглядаюць прыстойна і не выклікаюць нараканняў людзей.

— Мы разам з выканаўчай уладай знайшлі выйсце і першымі ў вобласці зрабілі замацаванне тэрыторый за прадпрыемствамі і арганізацыямі для навядзення парадку, — гаворыць Наталля Гатоўчык. — Гэты метад найбольш эфектыўны.

Чакалася, што могілкі будуць перададзены спецыялізаваным арганізацыям, але на самой справе так не адбылося — ва ўсякім разе, не ўсюды. Больш за тое, у абласцях і сельскіх раёнах вельмі чакаюць, што хутка ў рэспубліцы будзе выпрацаваны новы агульны падыход па добраўпарадкаванні.

— Пакуль жа ў кожнага — сваё, — прызнае старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Панцюхоў. — Здаралася, што я фатаграфаваў могілкі і асобныя паказваў потым калегам з месцаў: «Так нельга!» У Чэрыкаўскім раёне былі, дарэчы, заўсёды пазітыўныя здымкі. Наталля Раманаўна Гатоўчык і яе калегі прадумалі свае правілы, і гэтая схема добра працуе. Там не толькі могілкі, але і добраўпарадкаванне ўвогуле на высокім узроўні. Аднак падыход па Чэрыкаве характэрны не для ўсіх нашых сельскіх раёнаў, хоць вопыт гэты можна і трэба пераймаць.

Ілона ІВАНОВА.

КАЛЕКЦЫЯ ПЕРАТВАРЭННЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Ёсць тлумачэнне і таму, чаму ў сядзібе шмат «саўковых» рэчаў: некалі гэта была кантора калгаса імя Калініна. А калі яна стала непатрэбнай, Крыцкія выкупілі будынак. Распачаўся вялікі рамонт. Былы разбіты будынак ператварыўся ў гасцініцу з утульнымі нумарамі, а побач з помнікам пачалі ўзнікаць альтанкі. Пабудавалі яшчэ драўляны гасцявы домік, у хуткім часе з'явіцца сажалка. Была ў гаспадароў ідэя далучыць да сваіх уладанняў стары яблыневы сад, ды не паспелі — сад ужо выкарчаваны, сёння замест яго — поле з кукурузай. У гаспадыні ёсць яшчэ мара — зрабіць у сядзібе басейн пад адкрытым небам і завесці коней.

Калі журы конкурсу на лепшую сядзібу года завітала ў «Бабраняты», тут усё гуло: вялікая кампанія адзначала юбілей, а ў другой палове дня гаспадары чакалі новых гасцей. Тут людна кожныя выхадныя, прычым сядзіба не можа прыняць усіх ахвотных, бо мінімум на дзень просіцца 5-6 кампаній. І святкаваць юбілеі сюды едуць не толькі гараджане — старая кантора ў новым абліччы працягвае служыць і мясцовым жыхарам, якія

— Ляжу я ў бальніцы, мяняю сустаў. Часу вольнага там шмат — выкладаю на паперы думкі, чым бы хацела займацца... Пасля са сваімі прапановамі на дзвюх мыліцах прыходжу ў райвыканкам параіцца, што мне далей рабіць. Тут мне і прапанавалі заняцца аграгурызмам. Калі я выбірала месца, дзе б можна было распачаць такую справу, спынілася на самым лепшым. Тут навокал — лясы, побач Днепр, за 5 км ад нас — заказнік, — распавядае Людміла Эдуардаўна.

— А чым розніцца праца ў кавярні і сядзібе?

— Кавярня — гэта чысты бізнэс, а ў сядзібе можаш працаваць на сябе і атрымліваць задавальненне. У кавярні не можаш не абслужыць кліента — а прыходзяць яны розныя, у тым ліку і барыгі, п'яніцы. І ўсім трэба ўсміхацца. У сядзібе, калі не спадабаўся чалавек, я магу яму адмовіць. Дарэчы, мы тут два гады працуем, і яшчэ не было ні аднаго незадаволенага чалавека. Людзі прыязджаюць адпачываць, яны прыходзяць сюды шчаслівымі, бо ўсе праблемы «пакідаюць» дома, на працы. Безумоўна, многае залежыць ад гаспадароў сядзібы. Аграгурызм — гэта выключна

быць канцовачка. Напрыклад, гэты брусок не для бутафорыі прыбіты. Гэта раздзяляльны элемент. Многія такіх рэчаў не разумеюць, і ў іх атрымліваецца казарма, — распавядае Леанід Ходзька.

Дарэчы, Леанід — майстар спорту па шматбор'і, неаднаразовы чэмпіён рэспублікі.

Дамкі абсталяваны так, што турысты могуць гатаваць самі, але калі замовяць ежу, тут пададуць блінчыкі, варэнікі, юшку і іншыя стравы. Засаджаны агародзік, якім турысты могуць карыстацца бясплатна. Ёсць свае свінкі, коні. Сядзіба супрацоўнічае з Домам культуры. Напрыклад, тут спраўляецца Масленіца, а калі ёсць неабходнасць, можна зладзіць любое свята...

Прыватна-транзітны дамок

— У нас было жаданне мець уласны дом. Набылі яго ў вёсцы, бо гэта не так дорага, як у горадзе. Праз паўгода пасля таго, як засяліліся, каля дома спыніўся джып і вадзіцель пацікавіўся, ці можна ў нас пераначаваць... Вось так і вырашылі займацца аграгурызмам, — распавядае гаспадар сядзібы «Спатканне»

Сядзіба ў вёсцы Дземенка Петрыкаўскага раёна.

таксама з задавальненнем спраўляюць тут святы. Сярод каронных страў гаспадыні — бліны на дражджах з мачанкай і хатняй каўбасой, мяса і бульба ў гаршках з грыбамі і, вядома, уласныя нарыхтоўкі: саленні гаспадары робяць бочкамі...

Турысты могуць замовіць лазню, з'ездзіць у заказнік, на рыбалку, пакатацца на водных лыжах, ёсць у гаспадароў і каяк. Зімой тут катаюцца на санях.

Сядзіба працуе ўсяго гады два, але за гэты час ужо абзавялася пастаяннымі кліентамі. Гаспадары кажуць, што ёсць расіяне, якія сюды кожныя выхадныя прыязджаюць проста адпачыць, смачна паесці ці вязуць дзяцей, як кажуць, каб «паказаць, як людзі жывуць».

Адраджэнне кінутай кавярні

А вось сядзіба «Дзедзікаў» у вёсцы Олба Жлобінскага раёна стваралася на базе старой кавярні, дакладней, таго, што ад яе засталося: 10 гадоў гэта быў кінуты будынак, без дзвярэй, сцен. Пасля рамонту ў ім з'явіліся прасторная зала, дзе можна ладзіць дыскатэку, сталовая, гасцявыя пакоі і лазня. Побач — падсобная гаспадарка. Гаспадары трымаюць коз, трусоў, індакачак, індыкоў, курэй, свінак. Прычым турысты могуць адразу выбраць, каго б з гэтых жывёл ім сёння падалі на стол. А меню тут сапраўды для гурманаў — кураняты табака, фаршыраваныя індыкі, запечаныя трусы, самыя розныя стравы ў гаршках, бабка, дранікі, калдуны, заліўныя... Толькі салатаў і халодных закусак 30 відаў! Такі ж выбар і другіх страў...

Некалі ў гаспадыні была свая кавярня, але з-за цяжкай хваробы яна вымушана была здаць яе ў арэнду... Толькі без справы Людміла Дзедзік не засталася.

цікавая справа, калі не ператварыць яе проста ў бізнэс. Не трэба лічыць, колькі заробіш грошай з кожнага турыста — тады і атрымліваца ўсё будзе з душой. Важна, каб людзі, што прыязджаюць у сядзібу, адчувалі сябе так, быццам яны завіталі ў госці да сяброў.

Хутарок

Гэта назва сядзібы ў вёсцы Дземенка Петрыкаўскага раёна. У адным месцы створаны сапраўды цудоўны куточак, дзе прымаць гасцей гаспадар Леанід Ходзька можа адразу ў чатырох дамках, за кожным з якіх замацавана лазня. Дарэчы, як прызнаўся Леанід Уладзіміравіч, усяго ім створана ўжо 18 дамкоў, якія размяшчаюцца ў розных месцах, менавіта тут — куток для сямейных. Тут сапраўды можна выдатна адпачыць з малечай, яна знойдзе для сябе шмат цікавых рэчаў: пагушкаецца на арэлях, а за 40 метраў ад жытла — рака з паромам, выдатныя мясціны, дзе можна купацца.

Кожны з чатырох дамкоў — непаўторны. Так, у адным з іх «абыгрываецца» такі матэрыял, як мешкавіна, людзі спяць на ложках, набітых саломай. У іншым — шмат акцэнтаў на дрэве — так, натуральныя ствалы і галінкі цікава ўплецены ў інтэр'ер. Тут можна падглядзець шмат цікавых ідэй для афармлення інтэр'еру дома, дворыка. Сюды нават прыязджаюць спецыяльна, каб падглядзець тыя ці іншыя хітрыя хады ў будаўніцтве і аздабленні.

— Сапраўды хацелася ўсё зрабіць неардынарным, у дамках мы абыгрывалі розную тэматыку, колеры. Напрыклад, сёння становіцца папулярным чорнае дрэва, а мы з ім пачалі эксперыментаваць некалькі гадоў таму. Я маю інжынерную адукацыю, разумею, што кожнаму элементу павінна

ў Рагачоўскім раёне Сяргей Сергіенка. — Для нашай сям'і гэта, хутчэй, хобі. Калі такая справа пераходзіць у бізнэс, у маім разуменні гэта не аграгурызм.

А можа, ён і мае рацыю? Адна справа — проста здаваць дамок, а другая — быць побач з людзьмі. За шчырымі размовамі з гаспадарамі турысты сапраўды адкрываюць для сябе Беларусь. Сяргей Аляксандравіч мае гістарычную адукацыю, але галоўнае, ён цікавіцца гісторыяй і культурай свайго краю і можа шмат чаго распавесці гасцям і наладзіць ім цікавыя экскурсіі. Ён прасоўвае прадукцыю мясцовых майстроў, у яго доме шмат рэчаў, зробленых іх рукамі, і турысты часта замаўляюць сабе такія сувеніры. Сяргей шмат падарожнічае па раёне і часам у старых дамах, што падлягаюць зносу, знаходзіць рэчы, якія папаўняюць яго этнакалекцыю. У ёй ёсць ткацкі станок, стары дыван ручной працы, рыштунак для вырабу хромавых ботаў і шмат іншага...

Безумоўна, як чалавеку апантанаму, Сяргею ўдаецца не проста распавесці турысту пра нейкія рэчы, але і абудзіць эмоцыі. Уразіць можна не толькі легендамі, рамёствамі, а нават гісторыяй, якая здавалася такой знаёмай. Так, ён вазіў замежнікаў у «Чырвоны бераг», дзе стаіць помнік дзецям, якія пакутавалі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Замежнікі плакалі: тут яны ўбачылі зусім невядомую ім вайну. Але чаму тое, што ўражвае нават спрактыкаваных замежных турыстаў, якія аб'ехалі ўжо не адну краіну, застаецца незапатрабаваным на радзіме?

— Хацелася б, — заўважае Сяргей Сергіенка, — каб беларусы ўсвядомілі, што мы часта не ведаем ні сваіх каранёў, ні гісторыі, ні мовы... Час вяртаць памяць.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

НЕ ПОБАЧ, А РАЗАМ

працуюць у вёсцы Покрышава кіраўнік завода, прадстаўнікі мясцовай улады і жыхары

На пад'ездзе да вёскі Покрышава, што ў Слуцкім раёне, установлены значных памераў валун, на якім выбіта дата заснавання населенага пункта — 1535 год. Менавіта ў гэтым годзе вёска ўпершыню згадваецца ў дакументах, аб чым стала вядома дзякуючы высілкам старшыні Слуцкага воцатнага завода, дэпутата Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандра Рыбака і старшыні Покрышаўскага сельскага Савета Івана Гарбацэвіча. У той час у мястэчку была карчма, мелася 16 двароў. Сёння ж тут зарэгістравана 370 жыхароў.

Сучаснай вёсцы пашанцавала ў тым плане, што тут знаходзіцца даволі паспяховае ў эканамічным і фінансавым плане прадпрыемства — Слуцкі воцатны завод. Гэта адзінае ў краіне прадпрыемства, дзе атрымліваюць спіртавы воцат з дапамогай вырошчвання воцатнай бактэрыі на букавай стружцы. Менавіта гэта надае прадукцыі ўнікальны смак і непаўторны водар. А яшчэ больш пашчасціла населенаму пункту, што завод узначальвае дэпутат Мінскага абласнога Савета Аляксандр Рыбак, неардынарны і няўрымслівы чалавек і кіраўнік. Дзякуючы яго ініцыятыве Покрышава мяняе свой знешні выгляд, прыгажэе з кожным годам.

— У Аляксандра Валянцінавіча прыязныя і дзелавыя стасункі са старшынёй сельскага Савета Іванам Гарбацэвічам, старастамі, з якімі і вырашаюцца надзённыя мясцовыя праблемы, — адзначыў старшыня Слуцкага раённага Савета дэпутатаў Віктар Ражанец.

Для тутэйшых насельнікаў 8 жніўня — адметная дата. У гэты дзень два гады таму адбылося адкрыццё мясцовай славутасці — крынічкі. Да гэтага вада ледзьве прабівалася на зарослую кустамі паверхню. Па ініцыятыве Аляксандра Рыбака тэрыторыю расчысцілі, добраўпарадкавалі, а над крыніцай зрабілі драўляную пабудову. Сімвалічна, што ключ знаходзіцца паміж дзвюма вёскамі: у Замосці жывуць католікі, у Покрышаве — і католікі, і праваслаўныя. Нездарма каля крыніцы ўстаноўлены два крыжы — каталіцкі і праваслаўны, а выток асвячалі два святары — бацюшка і ксёндз. Назвалі крыніцу ў гонар Божай Маці Вастрабрамскай. Затым з' явілася прапанова ўзвесці тут купальню, у якой, дарэчы, вада аднолькавай тэмпературы ў любую пару года — 9 градусаў.

Аб'ект стаў сапраўднай народнай будоўляй. Бадай, няма ў раёне арганізацыі, якая б не брала ўдзел у агульнай справе. Дарожнікі добраўпарадкавалі дарогі, энергетыкі ставілі слупы і праводзілі электрычнасць, лясгас вырабіў малыя архітэктурныя формы з дрэва. А ёмістасць з нержавеючай сталі выдзеліў дырэктар Салігорскага сыраробнага завода, які калісьці ўзначальваў мясцовую гаспадарку.

— Так, мы нямала сродкаў укладваем у тое, каб вёска прыгажэла, заўсёды мела прывабны выгляд, а людзям жылося ўтульна, — распавёў галоўны інжынер прадпрыемства Міхаіл Лабковіч. — У прыватнасці, добраўпарадкавалі парк каля магазіна, паставілі там столік, лаўкі, афармілі альпійскую горку, кветнік.

Нядаўна ў забалочанай нізіне, дзе быў сметнік, выкапалі возера і зрабілі зону адпачынку. А замест старога арэшніку пасадзілі 500 маладых дрэўцаў, у тым ліку і рэдкіх для Беларусі парод. Гэтае месца палюбілася і дарослым, і дзецям: ёсць пляцоўка з атракцыёнамі для гульняў, кабінкі для пераапранання, летні душ, альтанкі. Тым больш што вадаём чысты, у ім можна купацца, што пацвердзіла мясцовая санстанцыя. Такіх у Слуцкім раёне толькі тры.

Літаральна на днях у Покрышаве агульнымі намаганнямі правялі свята вёскі на беразе новага возера, дзе менавіта да гэтага дня ўмельцы прадпрыемства змайстравалі фантан на вадзе.

Радуе вока на тэрыторыі завода імянная «Алея ветэранаў» з 25 маладзенькіх ліп. Вакол прадпрыемства, на яго тэрыторыі ўсюды афармлены клумбы, кветнікі, дзе з ранняй вясны і да позняй восені цвітуць розныя кветкі. Гэта заслуга дырэктара і галоўнага тэхнолага Жанны Мікалаеўны Шчарбіцкай, а па сумяшчальніцтве — галоўнага кветкавода, якая заказвае насенне і клубні па каталогах.

На думку старшыні райсавета, вельмі добра, што прадпрыемства забрала на свой баланс калгасную лазню, правяло тут рамонт і нават зрабіла невялікі басейн. Лазня карыстаецца попытам не толькі ў мясцовых жыхароў. Яе наведваюць жыхары суседніх вёсак і нават раёна. А нядаўна ў вёсцы рэканструяваны стары млын, дзе мяркуюць адкрыць этнаграфічны музей. Экспанаты для яго практычна ўжо сабралі. Частку прынеслі мясцовыя жыхары, а нешта знайшлі ў старых хацінах пры іх зносе.

Шмат высілкаў у добраўпарадкаванне вёсак уносяць старасты. Іх на тэрыторыі сельскага Савета 8. «Яны нашы незаменныя памочнікі, так бы мовіць, пасрэднікі паміж жыхарамі і органамі мясцовага кіравання і самакіравання», — канстатуе Іван Гарбацэвіч. — Напрыклад, яны арганізавалі збор сродкаў на добраўпарадкаванне могілак. Пачыналі з Замосця, а потым і іншыя сельсаветы падключыліся. Напрыклад, на ініцыятыву старасты вёскі Гарадзішча з Бокшыцкага сельсавета Яўгеніі Васільеўны Сыцько адклікнуліся практычна ўсе землякі. Грошы пайшлі на агароджу, выразку старых дрэў, якія ўяўлялі небяспеку. А вясной жанчына правяла суботнік, падключыла да справы не толькі вяскоўцаў, але і спецыялістаў, кіраўніцтва мясцовай гаспадаркі, якія пасеклі дровы і выдзелілі тэхніку для іх вывазу. Цяпер мясцовыя насельнікі плануюць пабудаваць на могілках капліцу.

Покрышава знакамітае яшчэ і тым, што тут ужо 53 гады загадвае фельчарска-акушэрскім пунктам Герой Сацыялістычнай Працы Сяргей Іванавіч Шклярэўскі. На ўсёй постсавецкай прасторы дзесьці толькі 5 медыкаў носяць гэтае ганаровае званне.

А ў цэлым у Аляксандра Рыбака і яго паплечнікаў шмат планаў на перспектыву. Прынамсі, разбіць у бліжэйшы час каля завода сад, які бы радаваў вяскоўцаў не толькі квеценню, але і сакавітымі пладамі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в н.п. Курганье, Алесино, Студенка, Дуброва, Заболотье Курганского сельсовета Смолевичского района Минской области

1	Форма проведения аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	12 сентября 2012 года в 15.00, д. Курганье, ул. Центральная, 8, Курганский сельисполком, зал заседаний
3	Продавец и его адрес	Курганский сельский исполнительный комитет, Минская область, Смолевичский район, деревня Курганье, ул. Центральная, 8
4	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	**Лот № 1 –** площадь 0,2480 га, № 624882506601000118, д. Курганье **Лот № 2 –** площадь 0,2128 га, № 624882500101000228, аг. Алесино **Лот № 3 –** площадь 0,2428 га, № 624882511101000137, д. Студенка **Лот № 4 –** площадь 0,2500 га, № 624882503101000071, д. Дуброва **Лот № 5 –** площадь 0,2392 га, № 624882504101000052, д. Заболотье
5	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6	Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания жилого дома
7	Начальная (стартовая) цена продажи	**Лот № 1 –** 19 674 030 рублей **Лот № 2 –** 38 298 480 рублей **Лот № 3 –** 18 354 770 рублей **Лот № 4 –** 29 601 000 рублей **Лот № 5 –** 9 110 650 рублей
8	Условия аукциона	а) продажа по цене не ниже начальной; б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательством Республики Беларусь; в) при подаче заявки на предмет аукциона одним участником, земельный участок продается при согласии участника по начальной цене, увеличенной на 5%.
9	Наличие инженерной инфраструктуры и преимущества	д. Курганье – электроснабжение, водоснабжение, асфальтированный подъезд, в перспективе – газоснабжение; аг. Алесино – электроснабжение, водоснабжение, асфальтированный подъезд, газоснабжение, развитая инфраструктура, есть озеро; д. Студенка – электроснабжение, асфальтированный подъезд, в перспективе – газоснабжение; д. Дуброва – электроснабжение, водоснабжение, асфальтированный подъезд, расстояние до г. Смолевичи – 10 км; есть озеро; д. Заболотье – электроснабжение, грунтовая дорога, богатые лесные угодья.
10	Условия оплаты	За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона
11	Сумма задатка и реквизиты продавца	10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3641000000045 филиал № 616 АСБ «Беларусбанк» ЦБУ 621 г. Смолевичи, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок»)
12	Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками	Каждый вторник в 10.00
13	Окончательный срок приема документов	06 сентября 2012 года в 17.00
14	Контактный телефон	8 01776 46 2 36, 46 2 46, 46 2 37, V 189 63 60

Расходы по организации и проведению аукциона (в т.ч. за изготовление документации), затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка (10% от кадастровой стоимости земельного участка) на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

ВАДАЛАЗЫ ДАСТАЛІ З ВАДЫ 1000 ПАТРОНАЎ

У Паставах вадалазы таварыства выратавання на водах з дна ракі Мядзелка ў акваторыі гарадскога пляжа, усяго за пяць метраў ад берага, дасталі цяжкі мяшок з боепрыпасамі. Высветлілася, што ў мяшку ляжала больш за 1000 патронаў калібру 7,92 міліметра і больш за 350 — калібру 7,62 міліметра.

Патроны знайшлі пры правядзенні аперацыі «Арсенал», у якой бралі ўдзел памежнікі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі. Усе патроны былі перададзены міліцыі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

20 августа 2012 года в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «ЭнКоСтрой».
Повестка дня:
1. О сделках Общества.
2. Об участии в других Обществах.
Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.
Начало регистрации в 11.30.
УНП 191303197

20 августа 2012 года в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Минскэнергострой».
Повестка дня:
1. О сделках Общества.
2. Об участии в других Обществах.
Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.
Начало регистрации в 10.30.
УНП 100008291

ОАО «Технолит Полоцк» извещает акционеров
о проведении **23 августа 2012 г.** в **14.00**
внеочередного общего собрания акционеров по адресу:
г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47
(актовый зал ОАО «Технолит Полоцк»).

Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров:
1. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.

С материалами по вопросам повестки дня собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47 (кабинет председателя НС) в рабочие дни (понедельник – пятница), начиная **с 16 августа 2012 г. с 9.00 до 16.00**.

Регистрация участников собрания будет производиться с **12.45 до 13.45** в день и по месту проведения собрания на основании: акционер – паспорт; представитель – паспорт и доверенность, оформленная в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30 августа 2006 г. № 1093 «Об утверждении Инструкции о порядке регистрации доверенностей, предусматривающих передачу прав, удостоверенных акциями».

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на **5 августа 2012 г.**

Наблюдательный совет ОАО «Технолит Полоцк».

Узденский районный исполнительный комитет 21 августа 2012 года по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 309 (3-й этаж) в 10-00 проводит повторный аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков, в 11-00 – аукцион по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов
На аукционные торги на право заключения договоров аренды выставляются следующие участки с начальной ценой:

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения)
Лот №1	Узденский райисполком	Земельный участок: г. Узда – ул. Новицкого участок №3	0,1389	625650100001000514	37 588 260	1 386 462
Лот №2	Узденский райисполком	Земельный участок: г. Узда –ул. Колхозная	0,0150	625650100005000430	1 100 075	1 635 337

Целевое назначение участка по улице Колхозная – для установки и обслуживания торгового павильона, по улице Новицкого – для строительства и обслуживания здания магазина. Участки свободны от строений. Инженерные коммуникации: по улице Новицкого – имеется возможность подведения к газоснабжению, водоснабжению, водоотведению. Срок аренды участков – 25 лет.

На аукционные торги по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов выставляются следующие участки с начальной ценой:

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей)
Лот №1	агрогородок Озеро, Озерский с/Совет	д. Сороковщина, ул. Радужная, уч.№8	0,2500	625682510101000053	52 000 000	84 000
Лот №2	агрогородок Озеро, Озерский с/Совет	ул. Васильковая, уч. №11	0,1500	625682508601000753	60 000 000	1 114 580
Лот №3	Дещенский с/Совет	д. Володьки, ул.Окружная, уч.№1	0,1516	625680202201000133	50 000 000	2 838 290
Лот №4	Дещенский с/Совет	д. Володьки, ул.Окружная, уч.№2	0,1516	625680202201000134	50 000 000	2 525 660
Лот №5	Дещенский с/Совет	д. Володьки, ул.Окружная, уч.№3	0,1585	625680202201000135	50 000 000	2 616 070
Лот №6	Дещенский с/Совет	д. Володьки, ул.Окружная, уч.№5	0,1553	625680202201000137	50 000 000	2 832 650

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания жилого дома.

К участкам имеется возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению и водоснабжению.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет 3602631002503 финансового отдела Узденского райисполкома в ЦБУ № 625 филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600203994, код платежа на право заключения договоров аренды 04002, код платежа по продаже земельных участков в частную собственность 04901. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, второй этаж, кабинет 210 с 8-00 до 17-00 по рабочим дням с 8 августа по 15 августа 2012 года включительно.

Заключительная регистрация – с 8.30 до 9.55 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны представить следующие документы:
- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by, либо по телефонам (801718) 65404, 54705, 65342.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНІКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 27.631. Нумар падпісаны ў 19.30 7 жніўня 2012 года.